ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 209 (3317) Пятніца 13-га верасьня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЁ У ГАДЗ. НОЧЫ:

ЛЁНДАН, 12. Ангельскі ўрад адправіў савецкаму ўраду ноту, у якой зазначаецца гатоўнасьць Англіі пачаць перагаворы па пытаньні аб аднаўленьні дыплёматычных зносін

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

685 тысяч рублёў на школьнае будаўніцтва

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Інспэктарыят народнае асьветы распрацаваў плян новага школьнага будаўніцтва. У будучым годзе намячаецца пабудаваць 75 двухкамлектных школ. Усяго на будаўніцтва гэтай сеткі мяркуецца затраціць 685 тыс. руб.

За бязьлітасную барацьбу з галоўнай небясьпекай—правым ухілам, прымірэнцтвам да яго і з „левымі" загібамі

БОЛЬШ РАШУЧА РАЗГАРНУЦЬ СЬМЕЛУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ Ў МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

(Рэзалюцыя сходу Менскага партактыву па дакладу тав. ГАМАРНІКА, прынятая аднагалосна)

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГАМАРНІКА аб выніках верасьньскага пленуму ЦК КП(б)Б, актыў Менскай арганізацыі КП(б)Б ухваляе ўсе пастановы пленуму, які праходзіў пад сьцягам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, цалкам далучаецца да адозвы пленуму ЦК да ўсіх членаў КП(б)Б і цалкам салідарызуецца з перадавой «Зьвязды» за 8-IX 1929 г.

Актыў з поўным здаваленьнем адзначае, што галоўнейшыя пытаньні будаўніцтва прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, уздыму актыўнасьці і вылучэньня рабочых кадраў абмеркаваны пленумам з усёй бальшавіцкай адказнасьцю і сур'ёзнасьцю.

Падагульваньне вынікаў, якое зрабіў пленум аб працы па сацыялістычным будаўніцтве за мінулы год (першы год пяцігодкі), яскрава сьцьвярджае правільнасьць лініі кампартыі ў справе бязупыннага пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне і разьбівае дашчэнту ўсю хлусьню правых апартуністых на ленінскае кіраўніцтва партыі.

Мінулы год, які зьяўляўся першым годам па ажыцьцяўленьні вялікага пляну перабудовы краіны, дае нам такія паказальнікі будаўніцтва, якія перавышаюць усе намечаныя пляны. Гэтыя паказальнікі яскрава сьведчаць аб тым, што мы маем усе магчымасьці для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі ў скарочаны тэрмін.

Усё гэта яшчэ больш выкрывае беспадстаўнасьць права-ўхілісцкай бухарынскай апазыцыі, якая страціла веру ў здольнасьць пралетарыяту хуткім тэмпам ісьці да будаўніцтва сацыялізму. Усё гэта бязьлітасна б'е правых беларускіх ухілістых, якія тармазілі пасьпяховасьць будаўніцтва, знаходзячыся ў кіраўніцтве НКЗ, сампрамкаапэрацыі і Наркамасьветы.

Актыў ухваляе ўсе ўжытыя меры ЦК па аздараўленьні кіраўніцтва Наркамзему, якое на справе ажыцьцяўляла права-ўхілісцкую тэорыю аб урастаньні кулака ў сацыялізм, насаджаючы хутары, і сваёй права-ўхілісцкай практыкай спрыяла росту кулацкіх элемэнтаў вёскі, што зьяўлялася адкрытым вызавам партыйнай лініі, што падрывала пасьпяховы тэмп сацыялістычнае рэканструкцыі вёскі, якая тым ня менш шпарчэй тэмпам ідзе па шляху калектывізацыі.

Пленум з усёй рашучасьцю выкрыў апартуністых, якія праводзілі правую лінію ў сампрамкаапэрацыі, прыкрываючыся асаблівасьцямі беларускага мястэчка, уцягваючы нэпманаў у каапэрацыю «ў мэтах прыцягненьня іх сродкаў і ініцыятывы ў каапэрацыю», чым разлагалі шэрагі каапэрацыі і наносілі яўную шкоду пасьпяховасьці наступленьня на прыватніка-нэпмана.

Актыў цалкам ухваляе як ужытыя меры, так і ацэнку, якую даў пленум дзейнасьці Наркамасьветы, дзе сапраўды ня была забясьпечана цьвёрдая клясавая лінія, дзе не давалася рашучага адпору варожай нам ідэалёгіі, дзе кіруючыя працаўнікі не займаліся пытаньнямі выхаваньня пралетарскіх кадраў. Усе вышэй адзначаныя недахопы ў рабоце паасобных органаў зьяўляюцца вынікам таго, што ў арганізацыі ня было выстарчальна разгорнутай сьмелай бальшавіцкай самакрытыкі. «Самакрытыка ў нас ня была ўзьнята на бальшавіцкую вышыню, у нас часта крытыкавалі, «гледзячы на асобы».

Таму перад Менскай арганізацыяй, на вачох у якое адбываліся ўсе гэтыя права-апартуністычныя дзеяньні паасобных членаў партыйнай арганізацыі, стаіць задача яшчэ больш рашуча разгарнуць сьмелую бальшавіцкую самакрытыку, накіраваўшы жорсткі агонь самакрытыкі супроць канкрэтных носьбітаў права-ўхілу, якія ў сваёй практычнай рабоце скрыўляюць генэральную лінію партыі. Разам з гэтым, Менская арганізацыя павінна таксама рашуча змагацца з праявамі трацкізму, з «левымі» наскокамі, тыпу Стэна-Шацкіна, якія, прыкрываючыся самакрытыкай, на самой справе адлюстроўваюць трацкісцкія погляды.

Актыў цалкам згаджаецца з тым, што ў момант разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, пры абвастрэньні клясавай барацьбы, праблема кадраў набывае першачарговае значэньне для ўсёй КП(б)Б.

Таму неабходна з усёй рашучасьцю вылучаць новыя пралетарскія кадры, замяняючы тых, хто ня здольны праводзіць цьвёрда ленінскую лінію партыі ва ўсім будаўніцтве.

Актыў заклікае ўсю партыйную арганізацыю да бязьлітаснай барацьбы з правымі ўхілістымі, якія шкодзяць пасьпяховаму правядзеньню лініі партыі, і патрабуе ад ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б) прыняцьця ўсіх захадаў да спыненьня шкодных дзейнасьці бухарынскай правай апазыцыі ў адпаведнасьці з ранейшымі пастановамі ЦК УсеКП(б).

Актыў лічыць патрэбным прапрацаваць рашэньні верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б ва ўсёй арганізацыі.

За бязьлітасную барацьбу з правымі ўхілістымі!

За разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі!

За рашучае вылучэньне і падрыхтоўку пралетарскіх кадраў!

З непарушным сталёвым адзінствам ленінскіх радоў—за пераможнае будаўніцтва сацыялізму!

Польская рабоча-сялянская дэлегацыя ў Барысаве

БАРЫСАЎ, 12. (Наш кар.). Пасьля агляду заводу імя Домбаля і фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» польская дэлегацыя прыняла ўдзел у агульна-гарадзкім сходзе рабочых у тэатры «Люкс», які ня мог зьмясьціць у сябе ўсіх жадаючых быць на сходзе.

Прадстаўнік ваенкому тав. Валуеў і рад рабочых ад розных прадпрыемстваў расказалі польскай дэлегацыі пра дасягненьні Барысаўскага раёну і яго прадпрыемстваў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

У сваю чаргу польскія дэлегаты расказалі пра зьверствы польскага фашызму і пра зьдзекі з рабочых і сялян у панскай Польшчы.

Дэлегаты запэўнілі прысутных на сходзе рабочых, што як вернуцца ў Польшчу, дык яны высьветляць хлусьню буржуазіі пра Савецкі Саюз і раскажуць пралетарыяту Польшчы пра тую вялікую будоўлю сацыялізму, якую праводзяць працоўныя СССР.

Дэлегаты былі захоплены сардэчнасьцю прыёму іх працоўнымі Барысава.

Сёньня дэлегацыя езьдзіла ў Лёзьнянскі нацыянальны польскі с.-с і азнаёміліся з яго работаю, а таксама наведала саўгас Весялова і с.г. тэхнікум.

Рабоча-сялянская дэлегацыя Польшчы ў Віцебску

ВІЦЕБСК, (Наш. кар.). Сёньня раніцай у Віцебск прыбыла рабоча-сялянская дэлегацыя Польшчы, Заходняй Украіны і Беларусі. На вакзале сустрэла дэлегатаў тысячная маса рабочых са сьцягамі і аркестрамі музыкі.

Дэлегацыя наведала яўрэйскі пэдагогічны тэхнікум, дзе падрабязна знаёмілася з працаю, аглядвала аўдыторыі, навучальныя габінэты і лябараторыі.

Польскія таварышы адзначылі жахлівае становішча нацыянальных школ у Польшчы, бясконцыя ганеньні і зьдзекі над імі. Затым дэлегаты накіраваліся ў Беларускі вэтэрынарны інстытут, а ўвечары наведалі адно з буйнейшых у Віцебску прадпрыемстваў—панчошную фабрыку.

Будуем самалёт „Чырвоны партызан Беларусі"

Чырвоныя партызаны былой Грэбенскай воласьці, Чэрвеньскага раёну, заяўляюць, што яны заўсёды гатовы да абароны Кастрычнікавых заваёў.

Чырвоныя партызаны патрабуюць ад нашага ўраду даць рашучы адпор сусьветнай буржуазіі і патрабаваць ад нанкінскага ўраду звароту ўсіх страт, нанесеных нам бандыцкім захопам К.-Усх. чыг.

У адказ на правакацыі кітайскіх генэралаў партызаны пастанавілі пабудаваць самалёт «Чырвоны партызан Беларусі», унесьлі 25 руб. 85 к. і выклікаюць усіх чырвоных партызан БССР.

Шлапакоў Д., Буры С., Місілевіч М., Буры П., Зыль І., Зыль К., Зыль М., Дзеркач П., Дзеркач А., Зыль П., Зыль А., Зыль М., Дзеркач М., Давіло М., Зыль Р., Зыль Ф., Фалей І., Суша А., Гаўрановіч М., Знак Я., Знак П., Знак А., Знак М., Авіло К., Малькавіч А., Кудзінові Я., Хурсевіч Х., Лаўрын П., Суша К., Аладко М., Зыль П., Зыль С., Гантман Б., Зыль М., Дзеркач С., Шары М.

Амэрыканская пазыка для Літвы

КОЎНЯ, 10. Як падаюць газэты, прыбыўшы ў Коўню амэрыканскі рабін Глазэр, родам з Літвы, перадаў літоўскаму ўраду прапанову амэрыканскіх фінансістых аб прадастаўленьні Літве пазыкі ў 50 млн. літ на выгадных умовах. (ТАСС).

ЧЫГУНАЧНАЯ КАТАСТРОФА

ВІЛЬНЯ. На ст. Дукшты вышоў з рэек паравоз вузкакалейкі ў зьвязку з няправільнаю ўстаноўкай стрэлкі. На 5 кілёмэтры ад Дукшт зышлі з рэек 2 таварныя вагоны. («К. Віл.» 197).

— 1-га верасьня на ст. Кракаў пасажырскі цягнік наскочыў на таварны. У пасажырскім цягніку разьбіты паравоз, у таварным—11 вагонаў. Паранена 11 чалавек. Прычына катастрофы—няправільная пастаноўка стрэлкі. («Роб.» 249).

Справаздача аб сходзе Менскага партактыву на 2-й старонцы

У суботу, 14-га верасьня г. г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса склікаецца

пашыраны парт. актыў Фрунзаўскай раённай арганізацыі

ПА ПЫТАНЬНІ

аб канкрэтных праяўленьнях правага ўхілу.

Разданыя білеты на 19-га верасьня г. г. маюць моц.

Члены ЦК, ЦКК, АК, АКК і РК уваходзяць па сваіх мандатах, астатнія — па білетах, атрыманых у ячэйках.

ФАШЫСЦКІ ТЭРОР У НЯМЕЧЧЫНЕ

Пад апекаю паліцыі і рэйхсвэру

БЭРЛІН, 9. У зьвязку з частымі замахамі на прадстаўнікоў улады і выбухамі бомб у апошні час ва ўрадавых установах, орган народнай партыі «Кёльнішэ Цэйтунг» піша, што палітычная атмасфэра цяперашняй восені многім прыпамінае абставіны 1921-22 г., калі былі забіты лібэралы Эрцбэргэр і Вальтэр Ратэнау.

«13 замахаў з бомбамі за апошні час,—піша газэта,—паказваюць, якія сродкі ўжываюць некаторыя колы супроць іх праціўнікоў».

Ваеннае міністэрства запрапанавала ўраду аштрафаваць дзьве газэты, у тым ліку і «Ротэ Фанэ» за тое, што яны зьвязвалі замахі апошніх дзён з работай рэакцыйных груповак рэйхсвэру. Ня гледзячы на гэта «Ротэ Фанэ» паранейшаму абараняе свой пункт погляду і зноў вазначае на дапамогу фашысцкім тэрарыстым з боку паліцыі і рэйхсвэру.

Арышты тэрарыстых-бамбістых у Бэрліне

БЭРЛІН, 11. Агенцтва Вольфа паведамляе: «У сувязі з апошнімі замахамі тэрарыстых-бамбістых, паліцыя арыштавала ў Бэрліне Тэхава, які ў 1922 г. быў прысуджаны да 4-х год турэмнага зьняволеньня за ўдзел у забойстве міністра замежных спраў Ратэнау. (Апошні забіты ў 1922 годзе фашыстымі, неадзноленымі яго палітыкай зблізжэньня з Антантай). Паліцыя арыштавала таксама кіраўніка адной з крайніх правых арганізацый Вэрнэра Ласа, пісьменьніка Саломэна і доктара Золінгэра, у якога жыў Саломэн. Усе гэтыя чатыры асобы, арыштаваныя ў Бэрліне, знаходзіліся ў самай цеснай сувязі з асобамі, арыштаванымі ў Гамбургу і ў Шлезьвігу. Як паведамляюць газэты, яны належалі да нацыяналісцка-анархісцкае тэрарыстычнае арганізацыі, у якую ўвайшлі былыя члены арганізацыі «Консул» (фашысцка-тэрарыстычнай).

***

БЭРЛІН, 12. Лік асоб, арыштаваных у вьвязку з апошнімі замахамі тэрарыстых-бамбістых, дасягнуў зараз 22-х чалавек. Паліцэй-прэзыдэнт Бэрліну паведамляе, што канфіскаваны ў вялікай колькасьці матар'ял з бяспрэчнасьцю ўстанаўляе, што асобы, арыштаваныя ў Бэрліне, знаходзіліся ў цеснай сувязі з арыштаванымі ў Шлезвіг-Гальштэйне. (ТАСС).

ПЕРАД ЗЬЕЗДАМ УНІТАРНАЙ КАНФЭДЭРАЦЫІ ПРАЦЫ

АДЗІНЫ ФРОНТ УРАДУ І РЭФАРМІСТЫХ

ПАРЫЖ, 10. Падрыхтоўка да зьезду ўнітарнай канфэдэрацыі працы працякае **ў выключна напружанай абстаноўцы. Супольныя намаганьні ўраду, рэфармістых і апазыцыі,** што існуе ўнутры ўнітарнай канфэдэрацыі; **накіраваны да зрыву зьезду, адрыву унітарнай канфэдэрацыі ад кампартыі і ўцягненьня ўнітарных прафсаюзаў у рэчышча рэфармізму.**

Ўрадавыя рэпрэсіі бязупынна ўзмацняюцца як у адносінах да асобных актыўных работнікаў кампартыі і ўнітарнай канфэдэрацыі, так і ў адносінах да прафсаюзных арганізацый. Мэр гораду Сэланкур (дэпартамант Дубс) Бермо зьняты з пасады ў зьвязку з выступленьнямі, якія мелі месца 1-га жніўня. У Парыжы арыштаваны рад рабочых дэлегатаў.

Нарэшце, паводле вестак «Юманітэ», **урад намераны забараніць арганізацыю зьезду унітарнай канфэдэрацыі ў памяшканьні мэрыі ў Клішы.** Сакратар унітарнай канфэдэрацыі мэталістых Галопэн у артыкуле, апублікаваным у «Юманітэ» рашуча дамагаецца арганізацыі зьезду ў Клішы, ня гледзячы на забарону паліцыі. Галопэн заклікае дэлегатаў энэргічна выступіць у абарону прафсаюзных правоў і падкрэсьлівае, што ў той час, як унітарыі падлягаюць прасьледваньням, **зьезду ўсеагульнай (рэфармісцкай) канфэдэрацыі працы, які склікаецца адначасова, урад дае дармова вялікае выгоднае памяшканьне.**

З свайго боку рэфармістыя ўсямерна стараюцца дэзарганізаваць рады ўнітарыяў і спачуваючых ім рабочых мас. Ужо другі дзень орган сацыялістых «Пэпюлер» вядзе паклёпніцкую кампанію, імкнучыся дыскрэдытаваць кампартыю цалкам, палітбюро кампартыі і рэдакцыю «Юманітэ».

Апазыцыя, ня гледзячы на адыход ад яе яшчэ аднаго з падпісаўшых маніфэст, менавіта Монтэнь, ня спыняе сваёй дэзарганізатарскай работы. Аднак, яе намаганьням з ранейшай сілай супроцьстаіць **рэвалюцыйная клясавая сьвядомасьць шырокіх рабочых мас.** Кангрэс мэталістых Парыскага раёну пераважнай большасьцю галасоў **ухваліў рэзалюцыю ўнітарнай канфэдэрацыі па справаздачы аб яе дзейнасьці і выказаўся на карысьць узгодненай работы ўнітарнай канфэдэрацыі і кампартыі.**

У фашысцкай Польшчы

КАНФІСКАЦЫІ

ВАРШАВА. У Любліне 27 жніўня канфіскаваны пэпэсаўскі «Дзеньнік Людовы» за справаздачу аб мітынгу ППС у Львове («Роб.» 242).

— У Варшаве 27 жніўня канфіскаваны «Наш Шэглёнд» за зьмяшчэньне артыкулу аб расстрэле камуністых Гібнэра, Руткоўскага і Кніеўскага. У артыкуле яўрэйскае буржуазнае газэты камісарыят ураду на Варшаву ўбачыў «выхваляньне злачынцаў». Адказны рэдактар «Нашага Шэглёнду» аддаецца пад суд. («Роб.» 242).

— Паліцыя ў Катовіцах 30 жніўня канфіскавала газэту «Палёнія» за артыкул: «Тэорыя і практыка сацыялізму». («Роб.» 245).

— У Варшаве канфіскаваны «Роботнік» (№ 247 за 2-IX) за справаздачу аб мітынгу ППС і «Хлопска Правда» (№ 14) за артыкул: «Што зрабіў для Польшчы ўрад Пілсудзкага» («Роб.» 249).

У Варшаве-ж канфіскаваны «Дзеньнік Людовы» (за 4-IX) за тры артыкулы: «Школа», «Ангельскія капіталы на дапамогу кансэрватыўным санатарам» і «Конкурс» («Роб.» 252).

ЭПІДЭМІЯ БРУШНОГА ТЫФУСУ

ВАРШАВА, 5. Эпідэмія брушнога тыфусу ў Варшаве пашыраецца. Кожны тыдзень захворвае 80-90 чалавек. («Гл. Пр.»). Адначасова з гэтым павялічваюцца выпадкі новых захворваньняў у правінцыі. Па падлічэньнях міністэрства ўнутраных спраў, нават у гады спакойныя ў эпідэмічным сэнсе ў Польшчы бывае 15-16 тысяч захворваньняў на брушны тыфус. («К. Віл.»).

Прысуд над камуністымі ў Роўні

ВАРШАВА, 11. У Роўні ў акруговым судзе слухаюць працэс 21 камуністага па абвінавачаньні ў анты-дзяржаўнай дзейнасьці. 11 чалавек прыгавораны да зьняволеньня ў катаржнай турме на 6 год, а 7—да 4 год кожны. Трое апраўданы. (ТАСС).

Апошнія навіны

Каля Нанкіна зноў згарэлі ваенныя склады

ТОКІЁ, 12. Па вестках з Шанхаю, 11 верасьня ноччу ў Пукоу (каля Нанкіна) згарэлі ваенныя склады, у якіх знаходзілася 500 аўтамабіляў, самалёты, амуніцыя і запасы харчу. Прычына пажару невядома. Падазраваюць падпал з боку праціўнікаў Чан Кай-шы.

Адстаўка нанкінскага міністра замежных спраў

ТОКІЁ, 12. Міністар замежных спраў нанкінскаега раду Ван Чжэн-Цін падаў у адстаўку, прыняўшы на сябе адказнасьць за дыплёматычныя няўдачы нанкінскага ўраду.

Становішча Чан Кай-шы крытычнае

БЭРЛІН, 10. Як падае пэйпінскі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагэблат», у Пэйпіне пашырана думка, што становішча Чан Кай-шы крытычнае. Ён захоўваў перавагу дзякуючы таму, што міністар фінансаў Су Цзо-вень ухітраўся здабываць сродкі шляхам унутраных пазык. Такім чынам, Нанкін атрымаў 400 млн. кітайскіх долараў пад заклад мытаў і акцызаў; цяпер-жа прымальныя для банкіраў прадметы да закладу амаль вычарпаны і далейшая рэалізацыя пазык вельмі ўтруднена. (ТАСС).

Няўдача нанкінскіх дыплёматаў у Жэнэве

ШАНХАЙ, 11. Як падае Ін Вэн-бао, Чжан Сюэ-лян запытаўся ў нанкінскім міністэрстве замежных спраў, якая сапраўдная пазыцыя нанкінскага ўраду ў адносінах да савецка-кітайскага канфлікту. Паводле слоў газэты, нанкінскае міністэрства замежных спраў адказала Чжан Сюэ-ляну, што Ліга Нацый ігнаруе Кітай, і што ня трэба разьлічваць на посьпех перагавораў, а прыняць далейшыя меры да пільнай аховы граніц. (ТАСС).

2 з пал. гады катаргі за хаваньне кнігі аб канстытуцыі СССР

ТОКІЁ, 11. Арыштаваны яшчэ да падзей на К.-Усх. ч. малады рабочы Гарышэнін, які абвінавачваўся ў хаваньні кнігі аб канстытуцыі СССР, прыгавораны да 2½ год катаржных работ. (ТАСС).

Адозва выканкому МОПР'у да працоўных усяго сьвету

МАСКВА, 11. Выканком МОПР'у апублікаваў адозву да працоўных усяго сьвету, у якой паказваецца на разгул белага тэрору ў Кітаі. Адозва заклікае рабочых усіх краін арганізаваць масавы пратэст супроць нанкінскіх і мукдэнскіх катаў. Абараняць сапраўдных змагароў за вызваленьне кітайскага народу. Абараняць рабочых і служачых К.-Усх. ч., якіх сотнямі зьнішчаюць кітайскія генэралы. (ТАСС).



ЧАН КАЙ-ШЫ—што ў нас там сёньня на парадку дня: ці абстрэл, ці арышты, ці адпаведная «миролюбивая» нота?

Па Савецкім Саюзе

ПЕРШЫ АБЛАСНЫ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ С.-Г. і ЛЯСНЫХ РАБОЧЫХ

У маскоўскім доме Селяніна 5-га верасьня 1929 году адкрыўся першы абласны зьезд прафсаюзаў с.-г. і лясных рабочых.

На здымку: Дэлегаты зьезду, 1) Батрачка-вылучэнка Калунова, Разанская губ. 2) батрачка, член райкому, Фролава і 3) батрак-рабочы саўгасу «Сельгастрой Марозаў

НА НЕПАРЫЎНЫ НАВУЧАЛЬНЫ ТЫДЗЕНЬ

ЛЕНІНГРАД, 10. Ленінградзкі палітэхнічны інстытут (першы з ВУЗ'аў СССР) увёў у сябе непарыўны навучальны тыдзень. Гэта дае магчымасьць прапусьціць без перабояў праз аўдыторыі і лябараторыі інстытуту ўсю масу студэнтаў, якая да гэтага часу ўзрасла да 9.000 чал.

Жахлівая катастрофа на Волзе

ЯРАСЛАЎЛЬ, 10. У панядзёлак а 2 гадз. дня на Волзе, каля прыстані, здарыўся выбух нафтаналіўное баржы «Мядзьведзіца», якая прышла з 3.000 тонамі парафіністага мазуту, для фабрыкі «Чырвоны Перакоп». У момант выбуху на баржы было 820 тон мазуту. Ад выбуху загарэўся мазут на баржы і параход Нафтасындыкату «Гром», які стаяў побач з ёю. Пацярпеў склад каманды «Мядзьведзіца» ў колькасьці 12 чал. з сем'ямі. Толькі двух рабочых каманды ўдалося выратаваць, рэшта разам з жонкамі і дзецьмі патапіліся ў гарэўшым мазуце. На параходзе «Гром» таксама пацярпела ўся каманда з 9 чал. Яны ў цяжкім стане адпраўлены ў больніцу.

Для расьсьледваньня прычын катастрофы ўтвораны дзьве камісіі: наглядальна сьледчая і тэхнічная.

Астраханшчына перад пралетарскім судом

Браты Салдатавы

АСТРАХАНЬ, 9. Раніцаю 9 верасьня суд прыступіў да выяўленьня «дзейнасьці» фірмы «Братоў Салдатавых». Тры браты Салдатавы—старыя рыбапрамыслоўцы—у 1925 годзе атрымалі на вельмі ільготных умовах у доўгатэрміновую арэнду промысел, які належаў ім раней. Хутка фірма братоў Салдатавых зрабілася буйнейшым у Астрахані прадпрыемствам, са зваротам да двух мільёнаў рублёў у год.

На чале фірмы стаяў Пётра Салдатаў, які сазнаўся ў тым, што ён даў Панкову хабар у 1.400 рублёў і Пратадзьяканаву—у 500 руб. Пасьля гэтых паказаньняў Пётра Салдатаў пакончыў жыцьцё самагубствам.

Увосені 1927 году Панкоў дапамагаў Салдатавым пераважна перад іншымі прыватнікамі. Панкоў, між іншым, узмоцнена хадайнічаў аб павышэньні цаны на воблу, што здавалася Салдатавымі. У часе асеньняй пуціны 1928 г. Салдатавы пры дапамозе Пратадзьяканава атрымалі норму, якая задаволіла іх промысел поўнасьцю, тады як прамысловы аграмаджанага сэктару мелі працу ў сярэднім толькі на 56 прод.

Пратадзьяканаў на працягу чатырох з лішнім месяцаў не спаганяў з Салдатавых штрафу ў 3.500 рублёў, накладзенага на іх у вясеньнюю пуціну мінулага году. У асеньнюю пуціну Пратадзьяканаў схаваў пад сукно рад актаў на Салдатавых за перавышэньне канвэнцыйных цэн.

Падсудны Якаў Салдатаў вінаватым сябе ня прызнаў. Дапытаны потым у зьвязку з гэтай справай Пратадзьяканаў зрабіў відавочную спробу зганьбіць сьледчых. Ён заявіў, што сьледчыя Барысаў і Казлоў, пагражаючы рэвальвэрамі, прымусілі яго, Пратадзьяканава, сазнацца ў атрыманьні хабару ад Салдатавых. Аднак, дяржаўны абвінаваўца Фрыдбэрг дакумэнтальна ўстанаўляе, што Пратадзьяканаў ня раз сазнаваўся ў атрыманьні хабару ад Салдатавых. Пратадзьяканаў вымушаны сазнацца, што гвалту з боку сьледчых ня было, але ўпарта сьцьвярджае, што хабару ня браў.

Былы загадчык гандлёвым аддзелам Панкоў таксама адмаўляе атрыманьне хабароў ад Салдатавых. Аднак, сьведкі ўстанаўляюць, што Панкоў жыў вельмі добра, набываў каштоўныя рэчы і вельмі шмат грошай патраціў у часе сваёй камандыроўкі ў Турцыю.

На запытаньне суду: «скуль Панкоў узяў гэтыя сродкі», Панкоў адказвае: «ня памятую».

Увечары 9 верасьня суд дапытваў сьведку Іванова—старога работніка гандлёвага аддзелу.

Іваноў характарызуе Панкова як Падхаліма і кар'ерыстага, што выяжджаў на чужых плячох, вёў раскошнае жыцьцё і падтрымліваў цесную сувязь з прыватнікамі.

Увосень 1927 году Іваноў зайшоў у габінэт да Панкова і ўбачыў такую сцэну: у габінэце сядзеў рыбапрамыслоўца Пётра Салдатаў, а каля яго стаяў Панкоў, у руцэ якога быў заціснуты жмут чырвонцаў. Убачыўшы Іванова, Панкоў замяшаўся і схаваў грошы ў кішэню. На наступны дзень Іваноў заявіў аб гэтым у ДПУ, але заява гэта засталася бяз вынікаў.

Гаворачы аб Пратадзьяканаве, сьведка адзначае яго ўпартасьць у сваіх абароны інтарэсаў прыватніка і рэдкую настойлівасьць, з якой Пратадзьяканаў дабіваўся дадатковых норм улову для прыватнага сэктару. «У часы Панкова і Пратадзьяканава—гаварыў сьведка—гандлёвы аддзел быў філіялам чорнай біржы. Прыватнікі цэлымі дзнямі штурхаліся ў іх габінэтах і часта вялі перагаворы пры зачыненых дзьвярох».

У фонд абароны краіны

Рабочыя працкалектываў шаўцоў, рымароў і рабочыя дзіцячай камісіі пастанавілі правесьці нядзельнік на карысьць фонду абароны СССР.

***

Настаўнікі Дрысенскага раёну адлічаюць 1 проц. пэнсіі на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны. Запісаліся 21 чалавек добрахвотнікаў.

***

Працаўнікі ЦКК НК РСІ уносяць адзін проц. месячнае пэнсіі ў фонд абароны СССР.

***

Рабочыя і служачыя аўтакіраўніцтва адлічаюць ½ проц. месячнага заробку ў фонд абароны краіны і абвяшчаюць сябе мабілізаванымі.

***

Тав. Гінзбург уносіць 2 р. 85 кап. (аднадзенны заработак) на пабудову аэраплану «Мазыршчына».

Палітыка правакацый і авантурызму

(Да крывавых падзей у Палестыне)

Ангельскі імпэрыялізм, сіяністкая буржуазія і жоўты меншавіцкі Інтэрнацыянал аднолькава нясуць адказнасьць за сотні ахвяр з боку арабаў і яўрэяў у Палестыне, за пакуты і няшчасьці тысяч уцекачоў, якія клічуць аб выратаваньні, за зруйнаваныя гарады і населішчы... Гэты рэакцыйны траісты саюз падрыхтаваў сваёю палітыкаю правакацый і авантурызму трагэдыю арабска - яўрэйскай разьні, крывавых жахаў карных экспэдыцый, ваенных судоў і расстрэлаў, якія адбываюцца цяпер у акупаванай ангельцамі краіне.

У выніку вэрсальскай сыстэмы дагавораў Палестына — «падмандатная тэрыторыя» Англіі. Ангельскія імпэрыялістыя пануюць у Палестыне, як і ў іншых падмандатных сваіх тэрыторыях, як паўнаўладныя гаспадары ў заваяванай калёніі. У Інкыі ангельскае калёніяльнае валадарства апіраецца, як вядома, на магамэтанскую меншасьць. Гэтай магамэтанскай меншасьцю ангельцы карыстаюцца ў якасьці прылады для эксплёатацыі іншага насельніцтва Індыі, якое больш, чым на 2/3 складаецца з індусаў. У Палестыне — наадварот. Тут ангельцы **галоўную сваю апору знайшлі ў яўрэйскім насельніцтве.** Яшчэ ў лістападзе 1917 году ангельскі міністар Бальфур апублікаваў ад імя ўраду сваю славутую дэклярацыю, у якой было абвешчана падтрыманьне імкненьням сіяністых стварыць у Палестыне «нацыянальнае вогнішча для яўрэйскага народу». Мэты ангельскага імпэрыялізму былі ясны: проціставіць арабскаму нацыянальнаму руху сіяністых, яьвесьці арабаў і яўрэяў у барацьбе за ўладу ў краі, забясьпечыўшы адначасова падтрыманьне акупацыйным уладам в боку часткі палестынскага насельніцтва, мясцовых прыхільнікаў сіянізму.

Выданьнем дэклярацыі Бальфура ангельскі ўрад меў на ўвазе прыцягненьне сымпатый яўрэйскіх мас усюды да справы Антанты, выклікаць асаблівае спачуцьцё яўрэйскага фінансавага капіталу ў Амэрыцы і адштурхнуць мільёны рускіх яўрэяў ад Кастрычнікавай рэвалюцыі, якая абвясьціла бязьлітасную барацьбу сусьветнаму імпэрыялізму ў тым ліку і вялікабрытанскаму.

Лёндан дасягнуў сваёй мэты: ангельскае войска засталося ў Палестыне, **а сусьветны буржуазны сіянізм стаў верным саюзьнікам акупацыйных улад у барацьбе з арабскім нацыянальным рухам.**

Першапачатковым назначэньнем лёнданскага плутакрата яўрэя Сэмуэля камісарам Палестыны, прадастаўленьнем сіяністым права рэгуляваньня іміграцыі, дапушчэньнем яўрэяў да ўдзелу ў кіраўніцтве і г. д. — ангельскія ўлады паказваюць сьвету, што гатовы нібы выканаць абяцаньні бальфураўскай дэклярацыі. З ростам-жа незадавальненьня сярод арабаў у Палестыне, выкліканым прадастаўленымі прывілеямі яўрэйскай меншасьці, з узмацненьнем нацыянальна-вызваленчага руху сярод арабаў Сірыі і суседніх правінцый — арабска-яўрэйскі антаганізм нагыбляецца з кожным днём і правакацыйная палітыка ангельскага імпэрыялізму пачынае даваць свае вынікі.

І даволі было інцыдэнту вакол нікчэмнага па сутнасьці пытаньня аб «Стене плача», каб Палестына стала месцам жорсткай арабска-яўрэйскай бойні, якая напамінае дзяжкія часы царскага рэжыму (яўрэйскі пагром 1902 г. і 1905 г.), або армянскую бойню ў Адане — 1909 г. пры млада-турэцкім рэжыме. Ангельскі-ж урад атрымлівае магчымасьць для выступленьня перад «цывілізаваным сьветам» у ролі «добрадзея» краю, які ўстанаўляе парадак і мір паміж варожымі народамі Палестыны. А ангельскае войска, якое павінна выйсьці з Эгіпту, ужо тым часам будзе адведзена ў Палестыну, ахоўваючы пільна палестынскі бераг Суэцкага каналу... Недарма чужаземная прэса зазначае на лоўкую руку Лёўранса, вядомага на сваёй нядаўняй дзейнасьці ў Аўганістане, як натхніцеля апошняга арабскага руху ў Палестыне.

Віну ангельскага ўраду за крывавыя падзеі ў Палестыне падзяляе цалкам і яўрэйская буржуазія, гэты верны дапаможнік вялікабрытанскага імпэрыялізму з часу выданьня Бальфураўскай дэклярацыі. Правадыры буржуазнага сіянізму — **Сокалавы, Вэйцманы і Жабацінскія, актыўныя супрацоўнікі ангельскага міністэрства ў часе сусьветнай вайны, арганізатары яўрэйскіх легіёнаў для армії Антанты, добра знаёмыя з крывавай калёніяльнай палітыкай хітрага Альбіёну, старанна ўтойвалі, аднак, ад яўрэйскіх мас сапраўдныя мэты Англіі на Блізкім Усходзе. Бальфураўскае абяцаньне растлумачвалася імі, як вялікадушны акт Англіі, які аддае паважанаму ёю «народу біблії» яго старажытную «Краіну Ізраіля».**

Вось, як аб гэтым літаральна пісалі сіяністыя ў 1917 г.:

«...здарылася вялікае цуда, і ўрады, і народы задумаліся над лёсам яўрэйскага народу; ...чалавецтва, якое стомлена крывавым жахам і сумуе па міры і справядлівасьці, зразумела, што настаў момант адкупіць векавы грэх сьвету ў адносінах да старажытнага народу і вярнуць яму яго законнае ўладаньне, ...прадстаўнікі сусьветнай дэмакратыі, а за імі і вялікабрытанскі ўрад у сваіх уласных інтарэсах і ў мэтах правільнага ўжываньня прынцыпа свабоды і самавызначэньня нацый, прызналі права яўрэйскага народу на яго гістарычную бацькаўшчыну».

Колькі цынізму і бессаромн

У атаку супроць правага ўхілу і нацыянал-дэмакратызму

Накіраваць агонь бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, па канкрэтных насіцелях правага ухілу, на выкрыцьцё прымірэнцаў да барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам

МЕНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПАВІННА ЎЗМАЦНІЦЬ СВАЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ

НА СХОДЗЕ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ

Апошні сход партыйнага актыву гор. Менску, які адбыўся 11-га верасьня, заслухаў даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гамарніка** аб выніках апошняга верасеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Вельмі важныя пытаньні, якія вырашаў пленум, задачы, намечаныя пленумам па гэтых пытаньнях, аб якіх дакладваў тав. Гамарнік, выклікалі вялікую ўвагу і зацікаўленасьць з боку партыйнага актыву.

Канкрэтныя факты праяўленьня правага ўхілу ў вямельнай палітыцы, нацыянальна - культурным будаўніцтве, аб якіх пленум ЦК ў сваіх пастановах сказаў сваё слова, на партактыве, сустрэлі жорсткае асуджэньне. Партактыў патрабаваў ад ЦК і ўсіх партарганізацый яшчэ больш жорсткай барацьбы з праявамі правага ўхілу, з фактамі скажэньня клясавай лініі ў гаспадарчай, нацыянальна - культурнай і ўсёй іншай рабоце.

Па дакладу тав. Гамарніка першым выступіў т. **Фрыдман.** Прамоўца, гаворачы аб вярбоўцы ў партыю перадавых рабочых, паказаў на тое ненармальнае становішча, што парт'ячэйкі не змаглі разгарнуць свае работы па прыцягненьні на адкрытыя партсходы рабочых мас.

Тав. **Мар'ясін,** гаворачы аб саматужна-прамысловай каапэрацыі, паказвае на тое, што арцелі, якія ахапляюцца сампрамкаапэрацыйным аб'яднаньнем, былі засмечаны да 1927 году, г. зн. да таго часу, калі там былі ранейшыя кіраўнікі. — У рабоце саматужна - прамысловай каапэрацыі, — кажа прамоўца, — ня было сьвядомага (?) ажыцьцяўленьня права - апартуністычных тэорый у практычнай рабоце, а было дапушчана на пэўным адрэзку часу рад палітычных памылак (?!). Гэтыя памылкі мы зараз з усёй сілай і навінны выпраўляць пры дапамозе ўсяе партарганізацыі.

Тав. **Галавач.** Я спынюся на двух пытаньнях: правым ухіле і культурна-нацыянальным будаўніцтве. На сёньняшні дзень тэорыі правых знайшлі сваіх пасьлядоўцаў і ў нас у КП(б)Б, і мы ўжо маем рад фактаў узорнай працы практыкі. Такая практыка была ў Наркамземе — сыстэма хутароў, розныя мінімальныя зямельныя нормы для беднякоў і кулакоў, празьмерная даверлівасьць буржуазным спэцыялістам.

Была яна і ў Белсамправкаапэрацыі, дзе часта рабілі стаўку на прыватную «ініцыятыву і сродкі», а ў выніку — засьмечанасьць каапэрацыі непманскімі і кулацкімі элемэнтамі.

Маем мы ажыўленьне актыўнасьці правых і ў культурна - нацыянальным будаўніцтве.

Я пералічу толькі некалькі фактаў: ліст трох беларускіх пісьменьнікаў, «тэатральная» дыскусія, ідэалізацыя мінулага беларускага нацыянальнага руху ў некаторых «гістарычных» артыкулах, высоўваньне некаторых асоб у акадэмікі. У прыватнасьці аб акадэміках я хачу сказаць, што нашы органы, якія высоўвалі акадэмікаў, у некаторых выпадках, відаць, спасавалі перад нацыянальным беларускім аўтарытэтам асобных «вучоных» і зрабілі іх акадэмікамі.

На фронце культурна - нацыянальнага будаўніцтва мы маем узмацненьне актыўнасьці нацыянал - дэмакратызму і маем факты змыканьня на гэтым вучастку правых з нашае партыі з буржуазнымі інтэлігентамі. І вось, ня гледзячы на такую ня бедную сэрыю фактаў з праваe практыкі, мы яшчэ і ў партыі і **асабліва,** я кажу, у камсамоле, не мабілізавалі, як трэба, мас партыйцаў і камсамольцаў для барацьбы з гэтай практыкай, для барацьбы в нацыянал-дэмакратызмам. Я проста заяўляю, што ў пытаньнях барацьбы в нацыянал-дэмакратызмам мы (камсамол) шмат чаго прамазалі. Аднэй з прычын гэтага зьяўляецца невыстарчальная разгорнутасьць самакрытыкі, аб гэтым сьведчаць ячэйкі Наркамзему, Наркамсьвяты, акадэміі, там ёсьць партыйцы і камсамольцы. Атрымліваецца так, што ячэйка Наркамзему пасьля ўжо на сходзе размахвае кулакамі, а як тварылася правая практыка, многія таварышы з ячэйкі пэўна не набраліся сьмеласьці сказаць аб гэтым партыі.

Зараз аб культурна - нацыянальным будаўніцтве. Мы маем ажыўленьне актыўнасьці нацыянал - дэмакратычнай буржуазнай інтэлігенцыі. Прычыны гэтаму — нашае рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і, як вынік гэтага, абвастрэньне клясавае барацьбы; актывізацыя беларускага кулака; уплыў нацыянал-дэмакратычных ідэй з-за кардону. У далейшым, з узмацненьнем культурна - нацыянальнага будаўніцтва з большым яшчэ набліжэньнем пралетарыяту да аўладаньня ўсімі культурнымі вышынямі, з далейшым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты, мы будзем яшчэ мець ажыўленьне нацыянал - дэмакратызму на працягу пэўнага перыяду. У зьвязку з гэтым нашымі задачамі павінна быць: мабілізацыя мас для самай рашучай барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам; поўнае аўладаньне працэсам культурнага нацыянальнага будаўніцтва, а ў зьвязку з гэтым галоўнейшая задача падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў. Тут камсамол можа і павінен зрабіць вельмі многае, а зроблена ў справе кадраў зусім мала.

У справе аўладаньня партыяй, пралетарыятам працэсамі будаўніцтва нацыянальнай культуры, асноўным ворагам зьяўляецца русацяпства сярод значнай часткі членаў партыі і камсамольцаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі па нац. пытаньнях. Ёсьць такія ў партыі і ў камсамоле псэўда-інтэрнацыяналістыя, якія, адмаўляюць нац. палітыку партыі на тэй аснове, што яны інтэрнацыяналістыя, а па сваёй сутнасьці зьяўляюцца вялікадзяржаўнымі расійскімі шавіністымі, адгэтуль задача рашучай барацьбы і з валікарускім шавінізмам.

Тое, што да гэтага часу партыя і пралетарыят ня сталі яшчэ цалкам на ўсіх вучастках на чале будаўніцтва нацыянальнай культуры, беларусізацыі, давала права асобным буржуазным інтэлігентам, нацыянал - дэмакратам прысвойваць сабе манаполію на «шчырых», «актыўных» і «адзіных» вырашаецяўу беларускага пытаньня. Нам трэба лёзунг пленуму ЦК КП(б)Б «Уся КП(б)Б на чале культурнага будаўніцтва» ажыцьцявіць в усёй рашучасьцю, трэба трымаць у сваіх руках ініцыятыву ва ўсёй працы па культурным будаўніцтве, а ў нас былі асобныя прарывы на гэтым фронце.

Для ажыцьцяўленьня лёзунгу пленуму ЦК партыі неабходна вытлумачыць самым шырокім масам рабочых, партыйцаў і камсамольцаў клясавую сутнасьць нацыянальнага пытаньня (многія гэтага не разумеюць), сутнасьць, якая заключаецца ў тым, што наша нац. палітыка, такія яе элемэнты, як беларусізацыя, будаўніцтва беларускай культуры, абслугоўваньне нац. меншасьцяй, забясьпечваюць кіраўніцтва рабочае клясы ў нашай краіне, пагрыбляюць давер'е да пралетарыяту і партыі з боку працоўнага сялянства і працоўных нацменшасьцяй, узмацняюць дыктатуру пралетарыяту. Тады мы хутчэй пераможам правых, якія хаваюцца часамі ў маску нацыянал - дэмакрата, тады менш будзем мець прарываў.

Тав. **Эпштэйн** паказвае на моманты, калі на выкрытыя друкам нездаровыя зьявішчы ў рабоце асобных парторганаў рэагуюць са спазьненьнем, а часамі наваг з невыстарчальнай увагай адносяцца да гэтае вялікае справы.

— Некаторыя партыйцы, нават адказныя работнікі, — кажа тав. Эпштэйн,— за самакрытыку, за выкрываньне нездаровых зьявішч лаюць наш друк. Дырэктар Белдзяржстрою Васэрман адну з газэт за выкрываньне бясчынстваў абзывае на партактыве «бульварнай газэтай». Гэткія асобы, як Васэрман, бачаць у друку ні больш ні менш, як сваіх ворагаў, якія па іх думцы «цкуюць сумленных працаўнікоў». Трэба па іх ударыць з усёй жорсткасьцю, трэба дапамагаць нашаму друку ў яго вялікай рабоце.

Тав. **Чалядзінскі** лічыць, што тав. Гамарнік у сваім дакладзе, націскаючы на праявы правага ўхілу на эканамічным фронце (Наркамзем, саматужна-прамысловая каапэрацыя), ня спыніўся як трэба на праявах правага ўхілу і на культурна-ідэалёгічным фронце.

Мы цярпелі гадамі прапаганду контррэвалюцыйнай нацыянал - дэмакратычнай ідэалёгіі праз часопісь **«Полымя», «Савецкую Беларусь»,** праз некаторыя падручнікі... У свой час ня лічылі патрэбным рашуча змагацца з гэтым. Цамыляліся. Мы ў сучасныя дні, ў разгар клясавае барацьбы бачым, як нацыянал-дэмакратызм злосна пашоў у атаку на нашу ленінскую нацыянальную палітыку, супроць дыктатуры пралетарыяту. Чарада выглашаных (праз друк і вусна) «тэорый», як: далей ад рэвалюцыйнай Масквы, бліжэй да капіталістычнага Захаду, адмаўленьне ў існаваньні беларускай буржуазіі, стварэньне нацыянал-дэмакратычных гэрояў (Кастуся Каліноўскага, Вярыгу-Дарэўскага), фальсіфікацыя гісторыі КП(б)Б, ідэалізацыя «Нашай Нівы» і г. д. і інш. — усе гэтыя і падобнага роду зьявы не прадстаўляюць сабой нічога для нас нечаканага і «загадачнага». Трэба разумець клясавую барацьбу ў нашай краіне, трэба ведаць зрухі ў фашысцкі лягер Пілсудзкага беларускай буржуазнай інтэлігенцыі ў Зах. Беларусі. Трэба нарэшце зразумець гэтую сувязь!

Нядаўна нацыянал-фашысты Луцкевіч выдрукаваў у Вільні сваю чарговую працу, якая зьяўляецца выкладаньнем праграмы беларускага нацыянал - дэмакратызму. Ён робіць стаўку на Вільню, як будучы цэнтр — сталіцу «дэмакратычнай» буржуазнай Беларусі. Луцкевіч разьвівае тэорыю «незакончанай беларускай нацыянальнай рэвалюцыі». Ён нікога непапікае з б. грамадаўцаў і нашаніўцаў, якія зараз знаходзяцца ў радох КП(б)Б. Ён лічыць, што «сапраўдная» Беларусь у часы «рэвалюцыі 1917-18 г. зрабіла толькі крок «наперад» да «нацыянальнага вызваленьня», да завяршэньня свайго «ідэалу» — гэта спынілася на этапе, калі завецца «БССР» —і... далей, задача Луцкевіча і яго дапаможнікаў Беларусь намкнуць на апошні крок «уперад» — гэта да БНДР з цэнтрам - сталіцай у Вільні, пад крылом Пілсудзкага. Для гэтай справы Луцкевіч ня «пужаецца» браць для сваей кнігі эпітэты з творчасьці некаторых беларускіх паэтаў, якія зараз знаходзяцца на тэрыторыі БССР, і тых паэтаў, якія часта на сходах у Доме пісьменьнікаў заўсёды лічаць сябе «пралетарскімі пісьменьнікамі». Аднак, горш усяго, што асобныя паэты дагэтуль яшчэ нявыказалі свайго голасу пратэсту супроць скарыстаньня іх імя Луцкевічам.

Ці займаліся мы як трэба вывучэньнем цэлага раду важнейшых у нашых умовах гэтых зьявішч, ці ведала як належа партыя, аб гэтых працэсах, ці мабілізаваны масы на рашучую барацьбу з нацыянал - дэмакратызмам? Трэба прызнацца, што не, спазьніліся, як адзначала перадавая «Зьвязды» і адозва верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Адзіная толькі «Зьвязда» сыгналізавала аб небясьпецы. У часы тэатральнай дыскусіі «Зьвязда» перад усімі сарвала «самабытную» маску, за якой хаваўся доўгія гады нацыянал - дэмакратызм, рынулася на рашучую барацьбу з ім, але... трэба шкадаваць, што атрымала ў гэтай барацьбе «рубцы» ня так ад ворага, як ад свайго прыяцеля... «Савецкая Беларусь» — апынулася зброяў у руках нацыянал - дэмакратаў для барацьбы са «Зьвяздой», супроць лініі КП(б)Б. Загэтым больш нецярпімым зьявляецца сёньняшняя перадавая «Савецкай Беларусі» наконт «прызнаньня» сваіх палітычных памылак. Я лічу, што гэта ня прызнаньне, а адвільваньне хвосьцікам. Патрэбна прамое асуджэньне сваіх учынкаў, прамое, безагаворачнае бальшавіцкае прызнаньне памылак.

Зараз вышаў з друку чарговы (ліпеньскі) нумар «Полымя» і рэдакцыя (ужо абноўленая) ні адным словам не абмовілася аб памылках часопісі, аб тым, што яна асуджае старую нацыянал-дэмакратычную лінію часопісі, і што гэту лінію бярэцца выправіць пабальшавіцку.

Наша Акадэмія Навук, створаная ў выніку Кастрычнікавае рэвалюцыі, у выніку ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, павінна быць лябараторыяй для вырабу на аснове марксысцка-ленінскага вучэньня нам навуковых сродкаў для пабудовы Сацыялістычнай Беларусі. Ці так яно ёсьць сёньня на справе? Ня зусім. Мы павінны ўлічыць «пляску» нацыянал - дэмакратаў Зах. Беларусі, ксяндза Станкевіча і К-о, якія сьцьвярджаюць, што акадэмія «іх»—нацыянал-дэмакратычная. Мы гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе» чыталі заметку, што ў Акадэміі займаюць адказныя навуковыя пасты людзі са стажам белагвардзейшчыны, расейскага чорнасоценства, як Цьвяткоў, нацыянал - дэмакраты, налёнафілы і іншыя людзі з пагрэшнасьцямі на разрад ніжэй.

А паглядзеце, чым займаюцца акадэмікі «савецкае» маркі, скажам як С. Некрашэвіч, за «савецкасьць» якога некарашэвіч, за «савецкасьць» якога некаторыя нашы адказныя таварышы гатовы пабіцца. Вось перад вамі таўшчэразная кніга — Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук Акадэміі. Якая роскаш, выдана на лепшай паперы, з кліше і рознастайнымі шрыфтамі. У ёй выдрукавана праца С. Некрашэвіча. Праца акадэміка С. Некрашэвіча, прадстаўляе сабою «салідны» досьлед нейкага «сьвятога пісанія прэпадобнага атца Касьяна Вераміты» XVII стагодзьдзя.

Ня будзем сароміць сябе, гаворачы аб гэтай працы памінам, аб марксызьме, што пры крытыцы гэтага «навуковага» досьледу Некрашэвіча трэба карыстацца цытатамі Маркса ці Леніна, даказваць, што для сучаснасьці ў палітычным сэнсе гэты «досьлед» «сьвятой пісаніны» «отца» Касьяна Вераміты — непатрэбная рэч, ён і ў навуковым сэнсе грошу— ня варты!

Кажуць, што гэта робіцца для ўзбагачэньня культуры беларускае мовы — дык вучэцеся, таварышы, беларусізуйцеся па «сьвятому пісьму прэпадобнага отца Касьяна Вераміты»!

Сур'ёзна, таварышы, трэба ставіць пытаньне аб рабоце нашай Акадэміі. Там слабы партыйны камуністычны асяродак. Там амаль адсутнічаюць навуковыя марксысцкія кадры. Пара ў Акадэмію накіраваць жывую крыніцу вылучэнцаў, навуковых працаўнікоў - камуністых. Пара ЦК КП(б)Б паставіць пытаньне аб мабілізацыі якой-небудзь сотні, ці больш, камуністых на вучобу ў марксысцкія ВНУ Савецкага Саюзу. Трэба ўмацаваць культурна - ідэалёгічны фронт!

Тав. **Шапіра.** Задачай партактыву зьяўляецца гарантаваць сваёй актыўнай працай поўнае выкананьне пастаноў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б, якія зьяўляюцца бязумоўна правільнымі і своячасовымі.

Ні ў дакладзе тав. Гамарніка, ні ў артыкуле ў «Зьвязьдзе» (ад 8-га верасьня) нима адказу на адно з важнейшых пытаньняў, якія мы павінны задаць як ЦК, так і «Зьвязьдзе»: як гэта здарылася, што ў важнейшым пытаньні клясавай барацьбы ў Беларусі, у пытаньні аб барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам патрабавалася дапамога «Комсомольской Правды», якая мае іншыя асноўныя задачы? А што «Комсомольская Правда» аказала дапамогу ў гэтым пытаньні, сьцьвярджае ці артыкул «Зьвязды», і тав. Гамарнік. Няўжо-ж без дапамогі «Комсомольской Правды» ніяк нельга было абыйсьціся? Я думаю, што тав. Гамарнік у заключным слове высьветліць гэтае пытаньне.

Зусім правільнае паказаньне т. Гамарніка аб тым, што «тэорыя» набліжэньня інтэлігенцыі да партыі і ўлады радам уступак зьяўляецца недарэчнай тэорыяй. А раз гэта так, дык неабходна, каб той адказны таварыш, які на XII зьезьдзе КП(б)Б яскрава сфармуляваў гэтую «тэорыю», рашуча і адкрыта адмовіўся ад гэтай сваёй думкі, што да гэтага часу ня зроблена.

Трэба дабіцца такога разгортваньня самакрытыкі, каб не тады загараўся «сьр-бор» у друку, калі ўжо зьнялі таго ці іншага наркома, а раней, каб наш друк загадзя сыгналізаваў-бы аб тых скажэньнях партыйнай лініі, якія наглядаюцца ў практычнай рабоце.

Трэба адзначыць, што практыка «штэмпэляваньня» і расхлябанасьці яшчэ мае шырокае распаўсюджаньне і зараз. Вось прыклад з курсамі вылучэнцаў, якія гэтымі днямі скончылі сваю работу. На гэтыя курсы было выклікана 120 чалавек рабочых ад варштату з усёй Беларусі, было патрачана на ўтрыманьне гэтых курсаў 10.000 рублёў, а калі падьводзяцца вынікі, высьвятляецца, што паводзін з курсантаў не скарыстаны на практычнай рабоце, бо забыліся прадугледзець па навучальнай праграме практычныя заняткі. А між тым праграма ўзгаднялася з усімі кіруючымі органамі. У ЦК КП(б)Б тав. Гольдзін палажыў штэмпэль, у ЦСПСБ таксама нехта «ўзгадніў», а ў выніку, як быццам, і вінаватых няма. І тым ня менш калегія Наркамасьветы (ужо пры новым кіраўніцтве), абгаворваючы вынікі гэтых курсаў, та трафарэце піша рэзалюцыю, дзе пералічаецца «рад дасягненьняў». А калі рабочыя пасьля двохмесячных курсаў паплі на прадпрыемствы, то там над імі сьмяюцца — захацелі высока залезьці, а вас не прынялі. З такой практыкай, з такімі «дасягненьнямі» трэба рашуча пакончыць.

Тав. **Ерухімовіч.** Я лічу патрэбным і карысным для партыі навяць тыя скажэньні, якія мелі месца ў БССР, сваім поўным імем. Сапраўды, хто адказвае за хутарызацыю Беларусі? Хто адказвае за гэты «посьпех» Наркамзему, які змог за пяць год «абагнаць і перагнаць» Сталыпіна? Ці адзін былы нарком Прышчэпаў? Не. Адказвае і ЦК КП(б)Б. Факты гаворыць аб гэтым. І ад гэтых фактаў не схавацца.

Яшчэ ў 1926 годзе камісія ЦК КП(б)Б па гаспадарчым будаўніцтве, заслухаўшы даклад Наркамзему, пастанавіла «лічыць неабходным падтрымаць у БССР пасялковую форму зямлякарыстаньня». У лютым 1928 г., ужо **пасьля** 15 партзьезду, пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што «практыка арганізацыі пасёлкаў паказала, што гэта форма зьяўляецца жыцьцёвай». Жыцьцёвай яна сапраўды зьяўляецца, але для каго? Для кулака, таварышы.

Тое самае адносна нацыянал - дэмакратызму. Чым тлумачыць, што ён так абнаглеў? Ці толькі «аб'ектыўнай» умовай, тым, што, бачыце, кулак вырас? Нельга ўсё ўзвальваць на «аб'ектыўныя» умовы. Нацыянал-дэмакратызм вырас, з ім, па сутнасьці, вельмі мала змагаліся. Гэта таксама факт, які нельга абвергнуць.

Хіба-ж аб апартуністычнай палітыцы Наркамасьветы Баліцкага ЦК КП(б)Б ні-чога ня ведаў? Хіба-ж з нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыяй, з нацыянал-дэмакратамі тыпу Жылуновіча, якія заўсёды ў партыю, змагаліся? Не! З імі лезьлі ў партыю, змагаліся? Не! З імі насіліся, супроць іх у ЦСБСР нельга было і выступаць! Цэнтральны орган КП(б)Б «Зьвязда» ня раз атрымлівала па руках за спробу даць адказ на атакі нацыянал - дэмакратаў супроць бальшавізму. «Зьвязда», гэта трэба проста сказаць, часта была адзінокай у гэтай барацьбе. ЦК КП(б)Б ахвотна надстаўляў сваю газэту пад удар, але не даваў у крыўду «багоў» з лягеру Жылуновіча, Баліцкага і іх партыйных, а галоўным чынам, беспартыйных прыяцеляў.

У гэтым сэнсе вельмі характэрна тое месца ў перадавіцы «Зьвязды», дзе гаворыцца аб тым, што «мы спазьніліся». Так, ЦК КП(б)Б спазьніўся. Але ў клясавай барацьбе, як і на вайне, няма «пустых» месц, няма спазьненьняў. **Калі вы спазьніліся, то пасьпеў нехта другі.** Пасьпеў клясавы вораг. Кулацтва ў БССР узмацнілася. Той, хто супярэчыць супроць гэтага сьвядома, або несьвядома, вольна або нявольна скажае ісьціну.

Тыя матар'ялы, якія ёсьць у маім распараджэньні, сьведчаць аб тым, што ўзмацненьне нацыянал - дэмакратызму мае сувязь ня толькі з актывізацыяй кулацтва, але і з тым, што ў нашым пралетарскім лягеры зроблены буйнейшыя памылкі. Чым вытлумачыць тое, што камсамол, найважнейшая палітычная арганізацыя, стаяў у баку ад барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам? Чым вытлумачыць, што работа прафсаюзаў БССР была прызнана камісіяй УсеЦСПС ніздавальнючай? Чым, урэшце, вытлумачыць тое, што «Савецкая Беларусь», «Полымя» бяскарна на працягу некалькіх гадоў цкавалі «Зьвязду», выступалі супроць Ленінскай лініі УсеКП(б)? Гэта ўсё факты аднаго і таго-ж парадку і сьведчаць яны аб тым, што мы маем у БССР некаторае паслабленьне клясавай пільнасьці.

Жылуновіч, Баліцкі і іх прыяцелі сюды ня прышлі, ня лічаць патрэбным выступаць. Трэба ім сёньня сказаць, што іх песенька сьпета. Партыя ня дасьць нікому бяскарна парушаць яе прынцыпы, яе лінію.

Супроць правага апартунізму, супроць нацыянал - дэмакратызму і прымірэнчых адносін да яго, за бальшавіцкую непрымірымасьць — вось пад гэтым лёзунгам мы згуртуемся за ажыцьцяўленьне пастаноў пленуму, які вызначыў шляхі да пералому ва ўсёй рабоце КП(б)Б.

Тав. **Агурскі.** Я буду гаварыць пра самакрытыку ў партыі. Тут тав. Шапіра ў сваім выступленьні задаў пытаньне: як гэта магло здарыцца, што «Комсомольская Правда» павінна была дапамагаць «Зьвязьдзе» ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам. Я адказваю: здарылася гэта таму, што некалькі часу таму назад, калі група таварышоў узьняла бой супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, дык ім не далі магчымасьці адкрыта выступіць.

У 1927 годзе тав. **Шапавалаў** напісаў артыкул на тэму «Шавінізм пад маскай бальшавізму» і, ня гледзячы на тое, што гэты артыкул правільна арыентаваў партыйныя масы ў пытаньнях небясьпечнасьці нацыянал - дэмакратызму, ён надрукаваны ня быў. І толькі зараз ён мае зьявіцца на старонках «Зьвязды». Другі прыклад. Калі тав. **Амбросенак** у артыкуле, які быў зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» ў сьнежні 1928 г., паказаў на тое, што нацыяналістычный выступленьні Жылуновіча не выпадковыя, то «Зьвязда» праз некалькі дзён вымушана была даць заўвагу і навіну атрымала за гэта вымову.

Я лічу, што выступленьне ў друку двух членаў ЦК т. т. **Бэйліна і Сянькевіча** супроць артыкулу Славіна, выступленьне, накіраванае на тое, каб з артыкулу Славіна зрабіць апазыцыйнае выступленьце, няправільнае. Бязумоўна, што ў артыкуле Славіна ў радзе месц была дана няправільная ўстаноўка, але факты ў артыкулах былі правільныя. І калі памянёныя таварышы выступілі супроць гэтага артыкулу агульна, то яны аб'ектыўна памаглі справе затушоўваньня небясьпекі нацыянал - дэмакратызму.

Калі я на XII-м зьезьдзе КП(б)Б выступіў і зьвярнуў увагу партыі на шкодную ідэалізацыю Кастуся Каліноўскага, якога паказваюць, як гэроя сялянскага руху 1863 году, дык мне далі на руках, сказалі, што гэтым ня трэба займацца на зьезьдзе. А тав. Ігнатоўскі сказаў, што тав. Агурскі хваліцца перамогамі, якія ён меў у справе барацьбы з ідэалізацыяй дробна - буржуазных партый. Па яго думцы, аб гэтым ня трэба гаварыць, бо спробы выступаць з ідэалізацыяй дробна - буржуазных партый разьбіты. Я тады сказаў, што яны не разьбіты. І зараз уся партыя можа ў гэтым пераканацца. Мы павінны яшчэ весьці жорсткую барацьбу супроць ідэалізацыі нацыяналістычных дробна-буржуазных партый, асабліва—у навучальных у становах, дзе атручваюць моладзь нацыяналістычнай атрутай.

* * *

Даклад і заключнае слова тав. ГАМАРНІКА будуць надрукаваны ў блізкіх №№ «Зьвязды».

Астраханшчына ў Менакрфа

Правыя апартуністыя з акрфа на працягу чатырох год скажалі клясавую лінію

Зажым самакрытыкі, кругавая парука і бязьдзейнасьць ячэйкі

«Справа» Менакрфа ўжо закончана. Менская акруговая кантрольная камісія зрабіла належныя вывады і прыняла рад канкрэтных пастаноў. АКК выкрыла ўсе тыя злачынствы і канкрэтныя віны правага ўхілу, якія знайшлі ве ганаровае месца ў рабоце ячэйкі апарату Менакрфа.

Пачынаючы з 25 году Менскі акрфа систэматычна скажаў клясавую лінію ў сваёй практычнай рабоце. Дзесяткі тысяч нэпманаў ня былі поўнасьцю абкладзены прыбытковым падаткам. Пры дапамозе акрфа большасьць прыслужнікаў рэлігійнага культу вызваляліся ад падаткаў. Папы, ксяндзы, рабіны, тылаапалчэнцы, з прычыны блізарукай, і шкодная палітыкі акрфа, былі недаабкладзены і не плацілі вайсковых падаткаў.

Уся работа акрфа за пэрыяд 1925-29 году ішла ў разрэз з лініяй партыі і савецкай улады.

Партыйнае кіраўніцтва ня было здольным праводзіць правільную партыйную лінію. Ячэйка не разгарнула самакрытыкі і не вяла ніякай барацьбы з канкрэтнымі праявамі прамага апартунізму.

Такі кароткі зьмест «справы» акрфа. Гэтымі днямі адбыўся сход ячэйкі акрфа, на якім старшыня Мен. АКК т. Дамброўскі зрабіў інфармацыю аб пастанове АКК па ўсёй гэтай справе. Сход ячэйкі лішні раз пацьвердзіў усе тыя факты скажэньняў клясавай лініі і права-ухілісцкай дзейнасьці ячэйкі і апарату акрфа, аб якіх пісала «Зьвязда» (№ 179) і якія прымусілі АКК хаця і з спазьненьнем прыняць правільныя і рашучыя пастановы.

„РАХУНАК" ПРЫВАТНІКА ГУРВІЧА

Звыш 20 нэпманаў Менску, буйных гандляроў і спэкулянтаў недаабкладзены. Такая клясавая «чулясьць» акрфа прынесла дзяржаве тысячныя страты. Нэпманы не плацілі падаткаў, а акрфа патураў прыватнікам ашукваць дзяржаву. Буйныя саматужнікі, якія эксплёатуюць наёмную сілу і маюць вялікія прыбыткі, таксама карысталіся пашанай апаратчыкаў акрфа. Гэтым саматужнікам пад рознымі шыльдамі даваліся ільготы, штучна зьмяншаліся лічбы прыбыткаў і г. д. У акрфа існавала цэлая сыстэма, пры дапамозе якое працаўнікі апарату самаддана і шчыра абаранялі інтарэсы прыватнага капіталу.

Цёмная асоба, прыватны пасрэднік **Гурвіч** скарыстоўваў больш паловы падатковых працаўнікоў у інтарэсах менскіх спэкулянтаў. Гурвіч шчодра крэдытаваў працаўнікоў акрфа грашыма, арганізоўваў папойкі і вячоркі. А потым прад'яўляў контр-рахунак: зьнізіць падатак з нэпманаў і гандляроў, даць адтэрміноўку і г. д.

Менскія гандляры пры дапамозе Гурвіча атрымлівалі па гэтым рахунку ільготы і зьніжэньне падаткаў, і клалі сабе ў кішэню тысячы, якія павінны былі быць у касе акрфа. Нэпман дзейнічаў, а камуністыя і савецкія працаўнікі акрфа спрыялі нэпманскай дзейнасьці. Менакрфа ганебна здаў свае пазыцыі ў барацьбе з прыватным сэктарам, проста кажучы, капітуляваў перад клясавым ворагам. Трэба-ж называць рэчы сваімі імёнамі.

Эпапэя п'янства, систэматычнае скрыўленьне клясавай лініі, моцнае сяброўства з нэпманамі расквіталі ў акрфа пры поўнай бязьдзейнасьці ячэйкі. Камуністыя праходзілі міма фактаў клясавага разлажэньня і правага ўхілу на практыцы. Ячэйка, ухваляючы прыгожыя рэзалюцыі аб барацьбе з правым ухілам, сама праводзіла яўна апартуністычную права-ухілісцкую і прымірэнчую палітыку.

Мы цалкам далучаемся да выступленьня на сходзе т. **Гельфэра** (новы сакратар ячэйкі), які адзначыў стопрэцантную замкнутасьць ячэйкі. Самакрытыка была зацішнута. Асобныя сумленныя партыйцы баяліся выступаць з кампрамэтуючымі матар'ялямі. Як у ячэйцы, так і ў калектыве панавала кругавая парука і сямейнасьць. Злачынствы замазваліся. Апартуністыя сьвяткавалі перамогу і ўдалымі маноўрамі душылі самакрытыку і спрыялі правядзеньню ў акрфа антыпартыйнай апартуністычнай палітыкі.

РЫЦАРЫ АПАРТУНІЗМУ ЗА РАБОТАЙ

Члены партыі—кіраўнікі ўстановы, **Танхілеўскі і Вострыкаў,** лічылі, што яны праводзяць «правільную палітыку». Гэтыя «камуністыя» насілі і носяць партыйныя білеты ў сваіх кішэнях і толькі гэтай прымітыўнай работай абмяжоўвалі выкананьне сваіх абавязкаў, як членаў партыі. Танхілеўскі, будучы загадчыкам акрфа, глядзеў скрозь пальцы, як працаўнікі апарату сябравалі з нэпманамі і як акрфа карыстаўся дапамогай прыватнага пасярэдніка (чытай: абараняў інтарэсы гандляроў).

Папы і рабіны вызваляліся ад падаткаў, тылаапалчэнцы не плацілі вайсковага падатку, у апараце расьцьвітала п'янства, фінагенты рабілі крымінальныя злачынствы..., а камуністы Танхілеўскі нічога не зрабіў для таго, каб зьнішчыць гэтую няправільную шкодную палітыку, гэтыя абураючыя правыя скажэньні клясавай лініі. За гэтыя заслугі герой правага ўхілу Танхілеўскі быў перакінуты на адказную работу ў Наркамфін, дзе ён працуе і зараз.

Член партыі **Вострыкаў,** які зусім нядаўна кіраваў акрфа, бліскуча працітваў слаўныя традыцыі Танхілеўскага. Пад кіраўніцтвам Вострыкава Менакрфа зьменшыў лічбы прыбыткаў прыслужнікаў рэлігійнага культу. У выніку—большасьць папоў, рабінаў і ксяндзоў недаабкладзена. Для ажыцьцяўленьня гэтай «задачы» інспэктары Менакрфа скарыстоўвалі ўсе сродкі і магчымасьці. Для таго, каб абкласьці дробнага саматужніка інспэктары павялічвалі іх прыбытак да мінімальнай нормы (701 руб.). Гэта сума прыбыткаў паводле закону ўжо падлягае абкладаньню. А для таго, каб вызваліць папоў ад падатку інспэктары акрфа штучна зьмяншалі іх прыбытак да 688 руб. і папоў і інш. прыслужнікаў рэлігійнага культу акрфа міласьціва вызваляў ад падатку. **Савецкія працаўнікі на савецкай клясавай работе сьвядома абаранялі прыбыткі кляркалаў.**

Затое, з якім захапленьнем Менакрфа праводзіў спагнаньні 3-рублёвых нядоімак і апісваў дамы за нявыплату ў тэрмін... 10 руб.

Вострыкаў акружыў сябе сваімі людзьмі, якіх ён перацягнуў з розных месц. У кліку Вострыкава ўваходзілі былыя кантрабандыстыя, спэкулянты і валютчыкі. Пад кіраўніцтвам апартуністага Менакрфа ўдала праводзіў права-апартуністычную палітыку. Адзін ухілісты зьмяніў другога. Дарэчы, ячэйкай кіраваў Петрашкевіч, якога прышлося зьняць з работы за п'янства.

СПАЗЬНІЛІСЯ НА... 4 ГАДЫ

Чаму гнойны нарыў у апараце акрфа мы ня ўскрылі своечасова ланцэтам пралетарскай самакрытыкі. Як магло здарыцца, што на адказным вучастку акруговага апарату на працягу трох год зажымалася самакрытыка і скажалася клясавая лінія. Было-б няправільным абвінаваціць ва ўсім толькі адну парт'ячэйку. Так—камуністыя акрфа выканалі ганебную і агідную ролю ва ўсёй гэтай «справе». Там, дзе трэба было сыгналізаваць аб фактах бытавога і клясавага разлажэньня і зрастаньня з прыватнікамі і клерыкаламі, там камуністыя або маўчалі, або... скажалі клясавую лінію, патуралі гандляром і спэкулянтам, п'янствавалі, заблытаўшыся ў павуціне правага апартунізму.

Але чаму раённы камітэт партыі, фракцыя АВК і ЦП саюзу саўгандальслужачых не папярэдзілі гэтыя факты. Таму, што адносіны фракцыі акруговага выканкому да кіраўніцтва акрфа могуць служыць прыкладам клясычнага фармалізму. Фракцыя АВК прагледзела правыя скажэньні ў фінансавым апараце акругі і лічыла, што кіраўнікі акрфа са сваімі задачамі спраўляюцца. Бюракратычна - павярхоўны падыход да нагляду за дзейнасьцю тым, што «ўсё добра» замест практычнага акрфа і чыноўніцкая ўпэўненасьць у ней дапамогі і сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва.

У гэтым-жа мы можам сьмела абвінаваціць і фракцыю ЦП саюзу саўгандальслужачых.

МенАКК зусім правільна падкрэсьліла бязьдзейнасьць фракцый АВК і ЦП саюзу ў сэнсе рэагаваньня на канкрэтныя праяўленьні правага ўхілу ў практыцы акрфа.

Нам здаецца, што на фрунзаўскім раённым камітэце партыі таксама ляжыць не малая частка віны. Фрунзаўскі райпартком,

Аб правым ухіле, становішчы і задачах ЛКСМБ

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМУ І ШАВІНІЗМУ УСІХ АДЦЕНЬНЯУ ЁСЬЦЬ АДНА З АСНОУНЫХ ЗАДАЧ КП(б)Б і КАМСАМОЛУ

КАМСАМОЛ! У ПЕРШЫЯ РАДЫ БАРАЦЬБІТАЎ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

(Рэзалюцыя бюро ЦК ЛКСМБ)

У сувязі з заслуханымі Бюро ЦК ЛКСМБ на сваім пасяджэньні вынікамі агляду комсамольскай організацыі Беларусі Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМ і ў сувязі з пастановамі верасьнеўскага пленуму ЦК КП(б)Б,— Бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Разам са здаровым у асноўным палітычным становішчам беларускай організацыі комсамолу, разам з згуртаванасьцю, праяўленай організаванасьцю ў барацьбе на працягу гадоў з контрраволюцыйным трацкізмам і яго рэшткамі і вядучайся зараз рашучай барацьбой супроць правага, яўна опортуністычнага ўхілу і прымірэнцкіх да яго адносін, як галоўнай небясьпекі сучаснасьці ў партыі і комсамоле мы маем рад прарываў, фактаў спаўзаньня ў асобных месцах а клясавых позіцый. Гэтыя факты скрыўленьня клясавай лініі перарасьлі ў яскрава правы ўхіл на практыцы, а гэты правы ўхіл у шэрагу месц нерарос у клясавую здраду (Сураская, Межанская, Глуская і Калінкавіцкая справы).

У вёсцы разам з цэлым шэрагам фактаў скажэньня клясавай пролетарскай лініі ў цэлай працы, разам з момантамі актыўнага супроцьдзеяньня і нежаданьня падтрымаць лінію партыі на колектывізацыю і пагалоўнае коопэраваньне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, мы маем факты, што на працягу цэлага шэрагу год многія ячэйкі капэракоп цьвёрдай установы ЦК ЛКСМБ аб колектывізацыі комсамольскіх гаспадарак скажалі лёзунг партыі ў гаспадарным будаўніцтве і пайшлі на лініі ўзмацненьня сваіх уласных гаспадарак, адмаўляючыся ісьці ў колектыўныя гаспадаркі. Аднэй з прычын усяго гэтага зьяўляецца слабасьць нашай работы на клясавым выхаваньні комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

У часткі комсамольцаў рабочых і беспартыйнай моладзі ёсьць моманты неразуменьня ўсёй сутнасьці соцыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці, а адсоль праяўленьні ў значным памеры фактаў вузка-цэхавых настрояў, хвасьцізму, рвацтва, недысцыпліванасьці. Гэтыя пібельныя для справы соцыялістычнага будаўніцтва настроі хоць і характэрны ў большай ступені для адсталых груп рабочых і моладзі, якая прышла нядаўна ў вытворчасьць з вёскі і мястэчка, усё-ж награжаюць і могуць сарваць наш удзел у соцыялістычным будаўніцтве.

2. Бюро ЦК ЛКСМБ канстатуе недастатковы цьвёрдую і пасьлядоўную арыентыроўку саюзу на няпрымірымую барацьбу з таорыяй і практыкай правага ўхілу і прымірэнцтва да яго. Гэта асабліва выявілася ў нэйтральных адносінах да «прышчапаўчыны», праваукланіцкай палітыкі Наркамзему, які кіруючыся ў сваёй шмат-гадовай дзейнасьці буржуазнымі тэорыямі аб «асаблівых шляхох разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў Беларусі», тэорыяй «узбагачайцеся», тэорыяй пашыранага НЭПу, на практыцы сярыяў узмацненьню эканомічнай магутнасьці кулацтва, росту хутароў і тым самым урэшце спрыяў узмацненьню палітычнай актыўнасьці кулака і яго ідэолёгаў. Усё гэта зьяўлялася тормазам ажыцьцяўленьня лёзунгу аб колектывізацыі вёскі.

Такая-ж права-ухілісцкая лінія праводзілася і ў Белсампрамкоопэрацыі, дзе рабілася стаўка на прыцягненьне сродкаў і ініцыятывы прыватніка, праз уцягненьне яго ў коопэрацыю, што прывяло да засьмечанасьці Сампрамкоопэрацыі пэйманскімі і кулацкімі элемэнтамі і да захопу ім кіраўніцтва ў паасобных звяньнях. Пастаўленыя партыяй на чале Белсамкоопэрацыі Мар'ясін і Зэльдовіч апынуліся на паваду у клясава-варожых нам элемэнтаў.

3. Комсамол Беларусі, хаця і дабіўся некаторых посьпехаў у галіне практычнага правядзеньня нацыянальнай палітыкі партыі ў частцы аўладаньня беларускай культурай і мовай, усё-ж такі Бюро ЦК ЛКСМБ прызнае гэтыя посьпехі зусім мізэрнымі. **Мы проста заяўляем, што комсамольская організацыя часам стаяла ў баку ад барацьбы з падняўшым галаву нацыянал-дэмократызмам,** які зьяўляецца праявай абвостранай клясавай барацьбы. **Комсамол своечасова не рэагаваў на спробы** нацыянал-дэмократаў і шовіністых усіх колераў стварыць адзіны нацыянальны фронт; на контррэволюцыйныя выступленьні трох беларускіх пісьменьнікаў Зарэцкага, Александровіча і Дудара ў «Савецкай Беларусі», на выступленьні Тодара Глыбоцкага (таго-ж Дудара), Жылуновіча і Зарэцкага ў тэатральнай дыскусіі, дзе яны праводзілі погляды аб самабытнасьці беларускай культуры; на выступленьне ў 1927 г. няці комуністых і двух беспартыйных (з якіх адзін былы прэм'ер белагвардзейскага беларускага ўраду) у «Савецкай Беларусі», накіраванае супроць ЦО КП(б)Б «Зьвязда», сыстэматычнае цкаваньне ЦО «Зьвязда» з боку нацыянал-дэмократаў; шэрагу іншых фактаў, дзе паміж асобнымі беларусамі, партыйцамі ўхілістымі і буржуазнымі нацыянал-дэмократамі сьціраліся ўсе межы. **Комсамольская організацыя ня была ўзброена для дачы адпору наступу клясавага ворага на ідэолёгічным фронце.** Комсамол яшчэ і зараз ня ўсё ўжывае для таго, каб па бальшавіцку, сьмела разгарнуць барацьбу супроць уняволеньня нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіі ва ўсё культурна-нацыянальнае будаўніцтва і школы. Трэба проста сказаць, што на паасобныя звеньні ЛКСМБ маецца моцны ўплыў нацыянал-дэмократычных буржуазных элемэнтаў.

Орган ЦК ЛКСМБ—«Чырвоная Зьмена» трымался «нэйтральнасьці» ў адносінах да нацыянал-дэмократычных выступленьняў у Беларусі. Тут пітрэбен сапраўды самы рашучы пералом.

4. Барацьба супроць нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў усіх адценьняў ёсьць адна з асноўных задач КП(б)Б і комсамолу. Гэта барацьба не на адзін дзень. Патрэбна рашучая мобілізацыя мас комсамолу пад кіраўніцтвам КП(б)Б супроць нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў. Бальшавіцкая непрымірымасьць да нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіі клясавага ворага. Ва ўсёй нашай выхаваўчай і палітыка-асьветнай працы трэба рашуча выкрываць нацыянал-дэмократызм, трэба рашуча заняць пераглядам нашых падручнікаў, дапаможнікаў і літаратуры, якая выдана і выдаецца зараз Белдзяржвыдавецтвам, каб забясьпечыць сапраўднае комуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Комсамол ва ўсіх порах савецкага і партыйнага жыцьця павінен з няпрымірымай стойкасьцю выкрываць і рашуча змагацца з усялякімі хістаньнямі ад ленінскай лініі партыі як на культурным фронце, так і гаспадарчым. Комсамольскія ячэйкі ВНУ тэхнікумаў, профшкол і другіх навучальных устаноў павінны даваць рашучы адпор рэакцыйнай профэсуры, нацыянал-дэмократычным настроям, шовіністычным праявам усіх адценьняў. **асаблівую ролю павінен адыграць комсамол у справе дапамогі партыі па выхаваньні пролетарскіх кадраў.**

5. Узмацненьне актыўнасьці нацыянал-дэмократызму, консолідацыя яго сіл, яго ваяўнічасьць тлумачыцца нашым рашучым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і выцікаючым адгэтуль абвастраньнем клясавай барацьбы.

Нацыянал-дэмократычныя і іншыя варожыя нам элемэнты рабілі і робяць націск і імкнуцца аўладаць позіцыямі на культурным фронце, што знайшло сваё адлюстраваньне ў цэлым шэрагу скажэньняў клясавае лініі кіраўніцтвам Наркамасьветы, дзякуючы працаваўшым там Жылуновічам ды іншым. НКА БССР ня толькі не забясьпечыў цьвёрдага выканьня партыйных пастаноў у культурна-нацыянальным будаўніцтве, але сваёй лібэральнай лініяй прыводзіў падчас да змычкі з нацыянальна-буржуазнымі элемэнтамі, сапраўднічаў поўнаму выхалашчаньню ленінскай лініі ў нац. політыцы партыі. НКА не зрабіў таго, што ён абавязан быў зрабіць для падрыхтоўкі пролетарскіх навуковых кадраў, разьвіцьця пролетарскай літаратуры, мастацтва і тэатру. **Такая лібэральная палітыка і практыка тлумачыцца яшчэ і тым, што ў БССР да гэтай пары ня было рашучага курсу на поўнае аўладаньне пролетарыятам усімі вышынямі культурнага будаўніцтва, а наадварот, перацэньвалася, а нярэдка прыраўнівалася да ролі пролетарыяту, роля нацыяналістычнай інтэлігэнцыі.**

Маецца праўленьне нацыянал-дэмократычных плянаў таксама і ў мастацкай літаратуры ў частцы продукцыі «Узвышша», «Полымя», у тэатры, кіно, пістарычнай навуцы, мовазнаўстве, у навуковых творах (адкрыта буржуазныя «працы» Лёсіка, Некрашэвіча, Жылуновіча, Байкова, Шырэева Клейнборта, Кісьлякова, Гарэцкага ды іншых).

БелАПП, роля якога ў справе барацьбы за пролетарскую літаратуру набывае выключна важнае значэньне, да апошняга часу амаль ня меў зусім падтрыманьня з боку комсамолу і іншых організацый. **Стварыць спрыяючыя ўмовы для працы БелАПП, заняцца выхаваньнем яго кадраў,—зьяўляецца важнейшай задачай комсамолу.**

6. Усе гэтыя выкрыўленьні ў нацыстаньні па сваёй сутнасьці зьяўляюцца ні чым іншым як праявамі правага опортуністычнага ўхілу ад ленінскай лініі партыі, аб чым яскрава гаварыў т. Гамарнік... «ці можна ўсё гэтыя ўхілы ад нашай нацполітыкі в боку комуністых увязаць з агульнымі ўхіламі ў партыі? Так, бясспрэчна, можна і трэба, бо ўсё гэта выяўленьне правага ўхілу ў партыі». Больш таго, праяўленьні правага ўхілу ў нацпытаньні пераносіліся ў практычную работу, чым супроць стаўліліся, на практыцы генэральнай лініі партыі. Вось чаму ЦК ЛКСМБ лічыць несумясьцімым прабываньне ў радох КП(б)Б і ЛКСМБ, тых, хто ідэёва і практычна змыкаецца з нацыянал-дэмократамі, хто прадае такім чынам інтарэсы пролетарскае дыктатуры. ЦК ЛКСМБ **заклікае ўсю організацыю з бальшавіцкай няпрымірымасьцю змагацца за ленінскую лінію партыі, за прынцыпы бальшавізму ў нацыянальным пытаньні, супроць правага опортунізму, супроць блёкуючыхся з нацыянал - дэмократамі і тым самым дапамагаючых клясаваму ворагу.**

Праводзячы энэргічную барацьбу а правай опозіцыяй, як галоўнай небясьпекай у партыі і комсамоле, комсамол у той-жа час не павінен паслабляць сваёй увагі да барацьбы в рэшткамі контрэволюцыйнага трацкізму і з «левымі» заскокамі тыцу Шацкіна-Стэна.

7. Барацьба за генэральную лінію партыі, змаганьне а скажэньнямі клясавай лініі і рашучае правядзеньне курсу на індустрыялізацыю краіны, на колектывізацыю сельскае гаспадаркі, на выкаваньне і выкаваньне з правышэньнем у тэмпах нашай пяцігодкі, магчыма толькі пры ўмове шырокай мобілізацыі мас навакол гэтых лёзунгаў партыі. Усе гэтыя задачы могуць быць выкананы намі з посьпехам **толькі пры ўмове самага рашучага разгортваньня бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі «не взирая на лица».**

Самакрытыка, зьяўляючыся адным з асноўных мэтодаў мобілізацыі мас, да гэтага часу ў комсамоле была разгорнута зусім слаба. У нас часта крытыкавалі «взирая на лица», КСМ яшчэ ня стаў на чале разгортваньня самакрытыкі так, як гэта патрэбна. «Чырвоная Зьмена» крытыкуе ўсё яшчэ недастаткова сьмела, не па баявому. Далёка невыстарчальна праводзіцца праца па мобілізацыі комсамолу і беспартыйных рабоча-сялянскіх мас на барацьбу з усялякага роду скажэньнямі партыйнай лініі і канкрэтнымі насіцелямі іх. Размовы наогул аб разгортваньні самакрытыкі партыю і комсамол задаволіць ня могуць, абстрактныя рэзолюцыі таксама. **Нам, комсамолу і «Чырвонай Зьмене», трэба змагацца за дзеючую самакрытыку, каб права-ухілісты, опортуністы, кулак, нэпман, клясава-варожы элемэнт, нацыянал-дэмократ, бюрократ і валакітчык, чыноўнік, прагульшчык, хвасьцісты і кожны, хто перашкаджае нашаму соцыялістычнаму будаўніцтве, адчувалі-б усю магутнасьць, вастрые і джала бальшавіцкае самакрытыкі.** Бюро ЦК заяўляе, што мыраштуча супроць сямэйнага выпрашэньня супярэчнасьцяй па асноўных прынцыповых пытаньнях нашай працы і прымірэнчых адносін да ўсялякіх ухілаў ад бальшавізму як у партыі, так і ў комсамоле.. **Мы, комсамольцы, павіны і абавязаны змагацца бязьлітасна з любой спробай скрывіць генэральную лінію партыі,** змазаць контр-рэвалюцыйную сутнасьць беларускага нацыянал-дэмократызму, ідэалізаваць яго мінулае, таксама і спробамі ідэалізацыі бундызму, ПІС і інш.

8. Мы павінны мобілізаваць грамадзкасьць комсамольскіх мас навакол пытаньняў барацьбы з узрастаючай небясьпекай усіх відаў нацыяналізму і шовінізму (беларускі, яўрэйскі, польскі). **Асабліва беларускага, як самага небясьпечнага на даным этапе.** Бюро ЦК ЛКСМБ, улічваючы, што асноўным ворагам на шляху аўладаньня працэсам будаўніцтва нацыянальнай культуры зьяўляецца вялікадзяржаўны расейскі шовінізм і русацэнтызм ў значнай частцы членаў ЛКСМБ, заклікае **ўсю комсамольскую організацыю рашуча змагацца з русацэнтызм і з усялякімі праявамі вялікадзяржаўнага расейскага шовінізму, усямерна ўзмацніць тэмп правядзеньня беларусізацыі і працэс аўладаньня пролетарыятам культурна-нацыянальным будаўніцтвам у БССР.** Усімі сродкамі дапамагаць разьвіцьцю культуры, «нацыянальнай па форме, пролетарскай па зьместу». Усімі сродкамі ўзмацняць абслугоўваньне нацменшасьцяй як па лініі эканомічнай, так і культурнай, узмацняючы інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўнай моладзі.

9. Пры наяўнасьці памылак у артыкулах, зьмешчаных у «Комсомольской Правде», на якія зусім правільна ўказаў цэнтральны орган КП(б)Б «Зьвязда» ў сваёй перадавой ад 8-IX—29 г., выступленьне «КП» адыграла вялікую ролю, бо яно значна дапамагло партыйнай організацыі, нашаму партыйнаму друку і ЛКСМБ шырэй паставіць працу па далейшай мобілізацыі мас на барацьбу з праяўленьнямі правага опортунізму і нацыянал-дэмократызму ў практычнай працы нашых органаў. Тым больш каштоўна гэта выступленьне «КП», што барацьба з гэтымі конкрэтнымі насіцелямі опортунізму ў нас у комсамоле была зусім невыстарчальна.

10. Складаныя адказныя задачы рэконструкцыйнага пэрыоду, шырокае разгортваньне працы пролетарыяту і комсамолу на чале з партыяй у справе выкананьня генэральнага пляну партыі, соцыялістычнага будаўніцтва, соцыялістычнага наступу на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, пры абвастрыўшайся клясавай барацьбе на ўсіх франтох—усё гэта прад'яўляе комсамолу рад вельмі сур'ёзных запатрабаваньняў у справе далейшага павышэньня клясавай балядольнасьці; у справе забесьпячэньня ў працы ўсяго камсамолу і кожнага комсамольца ў паасобку цьвёрдай і выразнай бальшавіцкай лініі; у справе няпрымірымага змаганьня з усялякага роду адхіленьнямі ад генэральнае лініі нашае партыі, у справе ўцягненьня ў соцыялістычнае будаўніцтва самых шырокіх колаў рабочага, батрацкай і бядняцка-сераднякцкай сялянскай моладзі.

Пастанову верасьнеўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб тым, што **«партыя зьнімала і будзе зьнімаць з кіруючай працы ўсіх тых, хто праводзіць права-ухілісцкую палітыку і практыку, хто прымірэнча адносіцца да выступленьняў кля савага ворага, хто ня можа забясьпечыць правядзеньня клясавай лініі ў працы, хто ня можа заядла па бальшавіцку правядзеньня клясавай лініі ў бязьлітасна змагацца за пераможнае соцыялістычнае наступленьне на ўсіх франтох нашага соцыялістычнага будаўніцтва».** Бюро ЦК ЛКСМБ цалкам і поўнасьцю падтрымлівае і заяўляе ЦК КП(б)Б, што гэтая лінія на барацьбу а конкрэтнымі насіцелямі опортунізму ў комсамоле сустрэне поўны водгук і падтрымальне.

Бюро ЦК ЛКСМБ яскрава разумее, што нам як мага хутчэй трэба ўзяцца за падрыхтоўку пролетарскіх кадраў, за аўладаньне камандныемі вышынямі як на гаспадарчым, так і культурным фронце.

Бюро ЦК цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастаноў верасьнеўскага пленуму ЦК КП(б)Б **«які вырашыў рад актуальнейшых пытаньняў соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР, стварае пераломны момант ва ўсёй рабоце КП(б)Б на фронце рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, рашучага правядзеньня выразнай клясавай лініі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, як па ліні бязьлітаснай барацьбы з правай ідэолёгіяй, так і практыкай, барацьбы з усялякімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі і сьмелага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі,** і заклікае ўсю комсамольскую організацыю да іх ажыцьцяўленьня.

Ленінскі Комсамол Беларусі будзе рашуча па бальшавіцку змагацца супроць прапавядваньня тэорыі ўступак нацыянал-дэмократызму і яго прадстаўнікоў, супроць прыніжэньня вядучай ролі пролетарыяту, супроць спроб прыстасаваньня лініі партыі да інтарэсаў і жаданьняў нацыянал-дэмократычна настроенай часткі інтэлігенцыі. Комсамол заклікае ўсю сумленна перайшоўшую на бок савецкай улады і працуючую на карысьць соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР інтэлігенцыю яшчэ мацней згуртавацца навакол дыктатуры пролетарыяту.

Мацней ударым па правых опортуністых, па канкрэтных насіцелях правага ўхілу!

Агонь па нацыянал-дэмократызму і шовінізму ўсіх масьцей!

Мацней, ня чакаючы на асобы, разгорнем масавую бальшавіцкую самакрытыку!

Мабілізуем усе сілы комсамолу на барацьбу за генэральную лінію партыі!

Бюро ЦК ЛКСМБ.

БАЯВАЯ ПРАВЕРКА НАБЛІЖАЕЦЦА

Разгорнем шырэй падрыхтоўку да манэўраў. Кожная арганізацыя павінна быць актыўным удзельнікам справы абароны краіны

Да ўсіх членаў Асоавіяхіму БССР

У бліжэйшы час на тэрыторыі Бел. Сац. Сав. Рэспублікі пачынаюцца манэўры Чырвонай армії.

Чырвоная армія — нязломная абарона дыктатуры пролетарыяту, якая пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры надзвычайна цяжкіх умовах у пэрыяд грамадзянскай вайны абараняла завяваньні Кастрычніка, а зараз, у пэрыяд мірнай працы, упарта працуе над вучобай, **падрыхтоўваецца да будучых схватак з пасягацелямі на сацыялістычную дзяржаву СССР.**

Праводзячы палітыку міру, савецкая ўлада скараціла сваю армію, тым самым адхіляючы ўсякую гутарку аб напым жаданьні вайны. А між тым клясавы вораг — капіталістыя ўсяго сьвету — ня могуць ніяк згадзіцца з існаваньнем, ростам і ўзмацненьнем рабоча-сялянскай дзяржавы. Гэта пацьвярджаюць налёты кітайскіх бандытаў на К.-У. чыг. — адна з самых гнусных правакацый імпэрыялістых за апошні пэрыяд. Таму ўзмацненьне абароны СССР і ўзмацненьне баявой моцы нашай Чырвонай арміі — абавязак кожнага працоўнага.

Манэўры арміі — не вайна, а навучаньне, як разьбіць ворага ў часе вайны.

На надыходзячых манэўрах наша Чырвоная армія праверыць свае баявыя веды, узбагаціць новай практыкай сваю баявую моц. Правяраючы тэхнічныя ўдасканаленьні, пашыраючы тактыку груповага бою, тым самым праявае сваю баявую гатоўнасьць да будучых клясавых боек.

Абавязак кожнага працоўнага, у першую чаргу члена Асоавіяхіму, акружыць найбольшай увагай, цёплым прыёмам усе часьці Чырвонай арміі, якія будуць прымаць удзел у манэўрах, усямерна дапамагаючы ім у выкананьні сваіх заданьняў.

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму Беларусі заклікае ўсіх членаў арганізацыі вывяўіць асаблівую ініцыятыву, дапамагаючы вайсковай часьці у справе разьмяшчэньня на начлег, на адпачынак, арганізуючы ўрачыстыя сустрэчы або провады, у справе здабываньня прадуктаў для чырвонаармейцаў, аховай тэлефонай і тэлеграфнай лініі, паказаньнем шляхоў і рамонтам апошніх і мастоў, калі яны папсаваны, і інш.

ЦС заклікае бюро ўсіх ячэек у раёне манэўраў арганізаваць працоўных для нагляду за працэсам бою і растлумачэньня ім тэхнікі, мэтадаў і баявой абстаноўкі.

Трэба памятаць, што нават і той, хто ня ўдзельнічае, а толькі наглядае, таксама многаму вучыцца.

Таварышы! Зрабецеся актыўнымі ўдзельнікамі ў справе ўзмацненьня абароны СССР. Шырэйшая папулярызуйце ўсё значэньне і важнасьць манэўраў.

Арганізуйце сустрэчы, гадары змычкі з часьцямі Чырвонай арміі, зьмяняючы манэўры ў сьвята аднаньня працоўных з Чырвонай арміяй — на ўзмацненьне абароны СССР.

Мы ня хочам вайны, але заўсёды гатовы даць адпор.

Усю ўвагу манэўрам — праверцы баявой гатоўнасьці Чырвонай арміі.

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму Беларусі ўпэўнены, што ў выніку шырокага ўдзелу ўсіх асоавіяхімаўцаў і працоўных у дапамозе манэўрам РСЧА яшчэ мацней і мацней стане адзінства шырокіх працоўных мас з Чырвонай арміяй, яшчэ лепш разгорнецца работа ў справе ўзмацненьня абароны адзінага ў сьвеце Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Нашае брацкае асоавіяхімаўскае прывітаньне ўсім чырвонаармейцам, камандному і палітычнаму складу.

Няхай жыве наша рабоча-сялянская Чырвоная армія!

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ АСОАВІЯХІМУ БССР.

Жанчына і манэўры

ГУТАРКА З ЗАГАДЧЫКАМ ЖАНАДДЗЕЛУ ЦК КП(б)Б т. КРЭМЭР

У будучых войнах на долю працоўнай жанчыны выпадзе не апошняя роля. Годы грамадзянскай вайны паказалі, што жанчына можа прымаць актыўны ўдзел як у якасьці байца, так і па лініі абслугоўваньня арміі і тылу.

У сучасны момант **вынікі работы вайсковых гурткоў, а таксама і ўся ваенная падрыхтоўка жанчын, якая праводзіцца Асоавіяхімам, павінна знайсьці сваё завяршэньне і праверку на надыходзячых манэўрах. Асабліва гэта датычыць прадпрыемстваў, дзе большасьць рабочых—жанчыны, і тыя, што запісаліся добраахвотнікамі ў Чыр. армію.**

Удзел працоўных жанчын у манэўрах павінен пайсьці па трох асноўных напрамках. Папершае, жанчыны ўвойдуць у склад атрадаў Асоавіяхіму і Чырвонага Крыжу ў якасьці зьвязістых, санработнікаў і інш. Падругое, павінны будуць усямерна скарыстаць манэўры для папаўненьня сваіх вайсковых ведаў шляхам нагляду за разьвіцьцём тактычных апэрацый. Нарэшце, на жанчыну падае адказная задача ўсімі сіламі дапамагчы баявой вучобе Чырвонай арміі.

Работа жанчын у складзе часьцей будзе працякаць пад агульным наглядам і кіраўніцтвам ваеннага камандаваньня. На гэтым пытаньні трэба толькі напомніць, што ад удзельніц манэўраў патрабуецца вялікая выносьлівасьць і сьвядомасьць.

Найбольш трудная задача — зрабіць жанчын раёну манэўраў сьвядомымі глядачамі разгортваньня апэрацый (у граніцах магчымага), выклікаць інтарэс да ўсяго, што адбываецца, скарыстаць манэўры для павышэньня сваёй вайсковай пісьменнасьці. У гэтых адносінах вялікая адказнасьць падае на мясцовыя ячэйкі Асоавіяхіму, і на жаночы актыў, у прыватнасьці на жанарганізатараў. **Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на тое, каб жанчыны былі падрыхтаваны да мер барацьбы з ваенна-хэмічнай небясьпекай.** Уменьне ўладаць процігазам, зазаваньне ўсіх правіл забесьпячэньня і маскіроўкі, барацьба з панікай — усё гэта павінна быць выканана работніцай, бяднічкай і сераднячкай у момант паказаных «нападаў праціўніка».

Чырвоны баец будзе праходзіць сваю вучобу на манэўрах у цяжкіх умовах. Паходы, выкананьне ўсіх патрабаваньняў баявой абстаноўкі, асеньняе надвор'е — патрабуюць ад яго вялікіх напружаных фізычных і маральных сіл. **Задача працоўных жанчын — усімі мерамі палегчыць гэтыя труднасьці, прадаставіць часьцям найлепшыя ўмовы адпачынку, акружыць іх увагай і клопатамі.** У гэтых адносінах роля працоўнай жанчыны набывае рашаючае значэньне.

У радзе месц жанчыны прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі сустрэч войска, зьяўляюцца ініцыятарамі збору падарункаў (ручнікі, анучы, кісеты, прадукты і інш.). Трэба ўсямерна гэта заахвочваць.

У заключэньне трэба адзначыць, што **пытаньне падрыхтоўкі да манэўраў і ўдзелу ў ёй працоўных жанчын, як і наогул пытаньне аб большым удзеле іх у справе абароны, павінна быць асабліва высьветлена на сходах, прысьвечаных перавыбарам дэлегацкіх сходаў. Як старыя, так і новыя дэлегаткі павінны быць прыкладам у гэтай справе, павінны разгарнуць шырокую кампанію агітацыі сярод мас працоўных жанчын.**

Спажывецкая каапэрацыя падрыхтавана

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня праўленьня Белкаапсаюзу т. Балцін паведаміў наступнае:

У работе па абслугоўваньні манэўраў спажывецкай каапэрацыі належыць цэнтральнае месца. Асноўнай задачай нашае працы ў гэтым напрамку зьяўляецца: забесьпячэньне вайсковых часьцей усімі відамі няпляннага харчаваньня і культурнага абслугоўваньня (чырвонаармейскія чайныя, сталоўкі для камскладу, кінасэансы, кніжныя ларкі і г. д.).

Спажывецкая каапэрацыя, як грамадзка-гаспадарчая арганізацыя, павінна адначасова прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы грамадзкай думкі вакол манэўраў.

Да гэтага часу ў напрамку абслугоўваньня манэўраў намі зроблена наступнае: *вызначана і падрыхтавана некалькі дзесяткаў перасовачных крам і ларкоў, якія адпраўлены ў вайсковыя часьці і будуць там знаходзіцца да канца манэўраў.* Ларкі і крамы забясьпечаны усімі відамі тавараў, патрэбных для чырвонаармейца (прадукты харчаваньня, пісьмовыя прылады, махорка, папіросы, ніткі і інш.). Акрамя таго, у *радзе месц утвараюцца стацыянарныя ларкі і крамы.* Апошнія зусім ужо гатовы для таго, каб распачаць абслугоўваньне. Усе адкрытыя *крамы забясьпечаны спэцыяльнымі партыямі завезеных тавараў.* У цэлым радзе пунктаў *абсталяваны сталоўкі* для тых з камскладу, якія ня будуць карыстацца агульным катлавым харчаваньнем. Для таго, каб забясьпечыць добраякаснасьць абедаў, *у раёны манэўраў перакінуты лепшыя кухары* з розных гарадоў БССР. *Чырвонаармейскія чайныя таксама ўсюды гатовы да адкрыцьця.* Вар для чырвонаармейцаў будзе адпускацца даромова, а чай па мінімальнай цане.

Тэхнічны пэрсанал намі падараны з лепшых працаўнікоў раду гарадоў. Усе гэта дае ўпэўненасьць у тым, што спажывецкая каапэрацыя справіцца з асноўнымі задачамі няпляннага здавальненьня вайсковых часьцей.

Але гэта ня значыць, што ўсе нашы арганізацыі аднолькава сур'ёзна аднесьліся да гэтага найбольш галоўнага пытаньня.

Пры аглядзе падрыхтаванасьці мясцовых арганізацый выяўлены рад упушчэньняў у гэтай важнай справе, у сувязі з чым былі ўжыты спэцыяльныя меры для выпраўленьня дапушчаных памылак.

Трэба адзначыць, што ў радзе раёнаў сіламі каапэрацыйнага актыву арганізаваны спэцыяльныя групы (у большасьці з моладзі), якія ў добраахвотным парадку будуць праводзіць продаж розных дробных тавараў у разноску (карабейнікі), і чырвонаармейцы ня будуць скапліцца ля стацыянарных лавак.

Разам з усім гэтым *патрэбна адзначыць недастатковую ўвагу* нутасьць у падрыхтоўчую работу да абслугоўваньня манэўраў *усяго каапэрацыйнага актыву. Апошнія дні што зталіся да манэўраў, трэба выкарыстаць для рашучага пералому ў напрамку мабілізацыі каапэрацыйнай грамадзкасьці вакол выкананьня гэтай найгалоўнейшай задачы.*

Скарыстаць манэўры для распаўсюджаньня кніжкі ў арміі і на вёсцы

Наша Чырвоная армія моцна і здольна да абароны Савецкага Саюзу ня толькі па сваёй вайсковай вывучцы, але і па сваёй палітычнай сьвядомасьці.

Вось чаму набывае важнае значэньне забесьпячэньне манэўраў усебаковай літаратурай як па ваенных, так і па палітычных пытаньнях.

Маючы гэта на ўвазе Белдзяржвыдавецтва ў райне манэўраў арганізуўае рад кніжных кіёскаў, палічак, куткоў і інш. Будуць ужыты належныя захады да распаўсюджаньня літаратуры і сярод навуковага насельніцтва. На ўсю літаратуру даецца 20-цігопрацантная скідка. Выдзелена звыш 500 бібліятэчак.

Белдзяржвыдавецтвам ужо выданы спэцыяльныя кніжкі, якія паступілі ў продаж. **Па пытаньні абароны і баяздольнасьці Чырвонай арміі выданы такія кніжкі:**

1. Кашын, Варапылаў, Літвінаў.—«Замеры буржуазай супроць СССР і мірная палітыка Савецтаў».
2. «10 год Чырвонай арміі».
3. Тухачэўскі—«Памятка чырвонаармейцу на манэўрах».
4. Прамова т. Варапылава на XV зьезьдзе УсеКП(б)—«Пытаньні абароны і пяцігадовы плян».
5. Ісбан—«Са стрэльбай і кнігай».
6. М. Івасьцюк—Ваенізацыя насельніцтва».
7. В. Папоў—«Чырвоная армія і яе задачы».
8. Краснапольскі—«Польскі салдат».

ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Даклад т. Калініна «Шляхі ўздыму сельскай гаспадаркі і падатковыя палёгкі серадняку».
2. Рэзалюцыі і пастановы XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі.
3. Якаўлеў—«Аб павялічэньні ўраджайнасьці».
4. Міхайлаў—«Задачы асеньняй с.-г. кампаніі 1929 году».
5. Бэрлін—«Як працаваць савету Ленінскага кутка».
6. Даклад т. Гамарніка на XII зьезьдзе КП(б)В і пастановы зьезду.

Акрамя гэтага гэтымі днямі з друку выйдуць і паступяць у продаж наступныя кніжкі.

1. Бульбянік: «Смех і радасьць вёскі» (зборнік вершаў).
2. «Як мы перамаглі ў грамадзянскай вайне».
3. «Пад польскім арлом».
4. Стрэле—«Што пастанавіў XII зьезд КП(б)В аб пяцігадовым пляне».
5. Карклін—«Перад вялікай работай». (Пяцігодка БССР).
6. Стракоўскі—«Праз 5 год».

Патрэбна прыняць усе меры да таго, каб гэту і шмат іншай літаратуры рэалізаваць ня толькі сярод чырвонаармейцаў, а таксама і сярод насельніцтва. З гэтай мэтай і зроблена скідка на літаратуру. Арганізацыі Асоавіяхіму павінны дапамагчы нам у гэтай справе.

Ул. Стр.

ПЕРАШКОДЫ, ЯКІЯ ТАРМОЗЯЦЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

У РАДЗЕ РАЁНАЎ ПАРТЫЙНЫЯ І КАМСАМОЛЬСКІЯ ЯЧЭЙКІ ТРЫМАЮЦЦА Ў БАКУ АД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.—У НАС ЗАБЫВАЮЦЬ АБ ТЫМ, ШТО КУЛАЦКІЯ І ВАРОЖЫЯ НАМ ЭЛЕМЭНТЫ НЯ СЬПЯЦЬ І ВЯДУЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ ШКОДНУЮ РАБОТУ СУПРОЦЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.—ТРЭБА ДОБРА ПРАВЕРЫЦЬ БЯРЭЗІНСКІ І ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ РАЁНЫ, ДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ РАЗВАЛЬВАЕЦЦА



Трактары на працы (калфонд Мар'іна)

Пра калектывізацыю ў Бярэзінскім раёне начутно

Камуністыя трымаюцца сваіх гаспадарак

Бярэзінскі раён (Меншчына) зьяўляецца адсталым у адносінах калектывізацыі. Тлумачыцца гэта перш за ўсё тым, што ў раёне слаба пастаўлена партыйная, камсамольская і палітасьветная праца.

Вясковыя камуністыя Бярэзінскага раёну да гэтага часу ня працавалі над арганізацыяй калгасаў. Яны па некаторых сельсаветах і цяпер яшчэ мала аб гэтым думаюць. Іх нават не разчарушыла і праведзеная чыстка партыі, якая, да рэчы сказаць, мала выявіла прыгоднасьць вясковых партыйцаў да новага жыцьця, іх жаданьне і здольнасьць перабудаваць вёску і пастав

ЗЬВЯЗДА
МЕНСК

ЗРЫВАЕЦЦА НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

154 тыс. руб. на вецер

Хто адкажа за прагул?

Навучальны год у вышэйшых навучальных установах Беларусі часткова зрываецца з-за адсутнасьці інтэрнатаў для разьмяшчэньня студэнцтва.

У менскім політэхнікуме ня маюць інтэрнату звыш 100 чал. Для разьмяшчэньня студэнтаў заняты падсобныя майстэрні політэхнікуму, як сталярная і інш. Частка студэнцтва знаходзіцца ў будынках польскага і яўрэйскага пэдтэхнікумаў.

Такое становішча не дае магчымасьці пачаць нармальна навучальны год. Пэдагагічная рада політэхнікуму вынесла пастанову аб адтэрміноўцы пачатку заняткаў на апошніх двух курсах на 1 з пал. месяцы.

На ранішнім рабфаку БДУ студэнцтва заняло пад інтэрнаты спартыўную залю і аўдыторыю, што адабіраецца на заняткох. Але і гэта ня вырашае становішча.

Для студэнтаў унівэрсытэту не хапае інтэрнату на 350 чал. У зьвязку з гэтым пачатак навучальнага году адкладзены на кастрычнік месяц. З-за наўвязкі з будаўніцтвам гарадка гэты тэрмін таксама знаходзіцца пад сумненьнем.

Трэба адзначыць, што месячны прагул ва унівэрсытэце па аднэй толькі зарплаце навуковым працаўніком і стыпэндыям студэнцтву будзе каштаваць 154 тыс. руб.

У ЦВ Пралетстуду і Наркамасьветы пытаньне аб забесьпячэньні студэнцтва інтэрнатамі стаяла ня раз.

Студэнцкія арганізацыі ўвесь час сыгналізавалі савецкай грамадзкасьці аб цяжкім становішчы з забесьпячэньнем студэнцтва інтэрнатамі, але яшчэ дагэтуль справа ня зрушана з месца.

На апошнім пасяджэньні СНК БССР запрапанавана менскаму гарсавету ў тэрміновым парадку вырашыць пытаньне з інтэрнатамі і праз два тыдні далажыць СНК. Гарсаветам утворана ўжо камісія з прадстаўнікоў Наркамасьветы, Пралетстуду і інш. арганізацый пад старшынствам тав. Дзічкоўскага, якой ЦВ Пралетстуду прапануе ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы.

Перадаць пад інтэрнат каменны будынак сынагогі на Ляхаўцы. Аб гэтым у свой час хадайнічала некалькі тысяч студэнтаў і навуковых працаўнікоў.

Для гэтай-жа мэты трэба перадаць дом па Ленінскай вул., дзе знаходзілася раней фабрыка Меншвэю.

Аб'яднаць у адным будынку Белсельбанк і Камунбанк з пераводам часткі работ на вячэрнюю зьмену. Тое-жа самае і ў адносінах ЦСУ.

Гэтыя мерапрыемствы трэба правесьці ў ударным парадку, каб атрымаць магчымасьць весьці нармальна навучальныя заняткі.

М. К.

Абураючы выпадак шкодніцтва

У Полацкім лесазаводзе пры пуску нанова ўстаноўленай рамы выкрыта шкодніцтва, якое толькі дзякуючы шчасьліваму выпадку не прывяло да аварыі і катастрофы.

Акалічнасьці гэтае справы наступныя. 4-га верасьня скончылася ўстаноўка новай рамы на лесазаводзе. Пры пробным пуску рама была зусім спраўная, але, калі 5-га верасьня прыступілі да работы, рама пачала даваць вялікія ваганьні, якія пагражалі поўнай паломкай рамы. Рамшчык перавёў раму на халасты ход і гэтым папярэдзіў катастрофу. Пры аглядзе камісіі аказалася, што ўсе 8 шруб на карэнных падшыпніках адвінчаны з яўна шкодніцкімі намерамі і нават ключ для завінчаньня шруб нехта ўкраў.

Пытань не аб гэтым выпадку абгаворана на сходзе рабочых заводу, які патрабаваў тэрміновага расьсьледваньня і прыкладнага пакараньня вінаватых.

Акрпрафбюро пастанавіла асьвятліць гэтае пытаньне на рабочых сходах і заклікаць усіх рабочых да рашучай барацьбы з шкоднікамі.

Справа перадана сьледчым органам.

Ш.

Бюрократызм і паперкі замест жывой справы

На Бабруйшчыне выяўлены вельмі нядбайныя адносіны да падрыхтоўчай работы да асеньняй сяўбы.

Кантрактацыя пасеваў дагэтуль выканана толькі на 30 проц., прычым яна мае пераважна індывідуальны характар.

Спаборніцтва там праводзіцца габінэтным парадкам—масы ня ўзьняты. З 28 саўгасаў толькі 6 падпісалі між сабой умовы на спаборніцтва. Але і тут падыйшлі да справы павярхоўна.

Аб дапамозе беднаце забыліся. Пры сяўнай кампаніі бедната амаль цалкам засталася без дапамогі. Бабруйскае раённае таварыства сельска-гаспадарчага крэдыту вылучыла 1.500 руб. на арганізацыю гужавых арцеляй, але грошы засталіся ляжаць нескарыстанымі.

А вось яшчэ яскравыя факты: акруговы паліявод. Зайцаў замест дачы вестак акрсельбанку аб патрэбным крэдыце, накладае на адносіне рэзалюцыю «весткі даны», і падшывае яе «да справы». А раёны на месяц пазьней атрымалі крэдыты.

Заг. зем. часткі Бабруйскага РВК Курылаў на дырэктыве, атрыманай ад АВК, аб асеньняй сяўбе накладае рэзалюцыю «аграному», сам-жа не праверыў выкананьня дырэктывы.

Рагачэўскі райаграном Курганскі такую-ж дырэктыву падшывае «да справы», а ў раённым пляне пакідае шмат прабелаў.

Загадчык саўгасу Жылічы Баравік на атрыманым загадзе аб дапамозе беднаце налажыў рэзалюцыю: «Бухгальтэрыі да кіраўніцтва». Вядома, што бухгальтэрыя дапамогі даць ніякай не змагла.

Тое-ж самае заўважаецца і ў іншых раёнах—аб дапамозе беднаце там толькі ёсьць агульныя разважаньні, проста аддалі даніну «належнаму».

Для правядзеньня ачысткі насеньня (для аплаты кіраўнікоў абозаў) не знайшлі сродкаў... У Слуцкім раёне дайшлі да спагнаньня платы з сялян за ачыстку насеньня.

Ш.

АДЧЫНЕНЬНЕ ФРУНЗ. РАЕННАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ МОПР'у
ПЕРАНОСІЦЦА З СУБОТЫ, 14-IX
на нядзелю, 15-га верасьня
у 10 гадзін раніцы ў памяшканьні клюбу харчавікоў (Школьная № 1).
Пасяджэньне фракцыі там-жа адбудзецца, а 9 гадзіне раніцы.
Усе абраныя делегаты павінны зьявіцца ў райком МОПР'у (Савецкая, 87) за атрыманьнем мандатаў.
Фрунз. РК МОПР'у.

У Акрвыканкоме

Перавод устаноў на вячэрнюю работу

Прэзыдыум акрвыканкому 11 верасьня ўтварыў камісію для распрацоўкі мерапрыемстваў па пераводзе некаторых устаноў на вячэрнюю работу з мэтай папярэдняга жыльлёвай плошчы. Склад камісіі наступны: старшыня Паромчык, члены: ад РСІ—Дамброўскі, ад інспэкцыі працы—Сакалінскі, ад аддзелу аховы здароўя—Нісэнбаум і ад адміністрацыйнага аддзелу—Кроль.

Расьсьледваньне па справе Вадаканалу

Прэзыдыум даручыў пракурору безадкладна расьсьледваць справу з лопнуўшымі кругамі на пабудове каналізацыі і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці. Камгасу даручана аказаць тэхнічнае садзейнічаньне шляхам вылучэньня адпаведных тэхнічных працаўнікоў.

Пад пагрозай зрыву

Пабудова трамвайнага парку пад пагрозай зрыву. Нарад на пачатак працы быў даны 6 жніўня, а зараз толькі вырыты катлаваны, праца ідзе надта марудна, усяго працуе 15 рабочых. З такім тэмпам мы застанемся на зіму без трамвайнага парку.

Прэзыдыум, заслухаўшы інфармацыю т. Цапкаватага аб пабудове трамвайнага парку, пастанавіў: да 15 кастрычніка парк павінен быць скончаны.

Усебеларускі зьезд ІТС

Прэзыдыум цэнтральнага бюро інжынэрна-тэхнічных сіл чыгуначнага транспарту прызнаў патрэбным склікаць у другой палове верасьня ўсебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі. Зьезд заслухае даклады аб чарговых задачах сэкцыі, аб пяцігадовым пляне народнае гаспадаркі БССР і аб пяцігадовым пляне разьвіцьця чыгуначнага транспарту, аб папярэдніх выніках сацыялістычнага спаборніцтва і ўдзеле ў ім інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў.

Барацьба з бязьбілетным праездам

З 20-га жніўня па 20-ае кастрычніка па ўсёй МБВ ч. праводзіцца конкурс на лепшую кандуктарскую брыгаду, на больш сьвядомыя і добрасумленныя адносіны да барацьбы з бязьбілетным праездам, правозам лішняга ручнога грузу і на лепшае тэхнічнае абслугоўваньне пасажырскіх дягнікоў. Для лепшых брыгад устаноўлена 5 прэмій ад 75 да 200 руб. кожная.

210 тыс. плугоў у год

У 1929-30 годзе Белмэталятрэст выпусьціць прадукцыі на 18.999 тыс. руб., на 47 проц. больш, чым у мінулым годзе. Значна павялічваецца выраб с.-г. машын. На капітальныя работы вызначаецца да 5 мільёнаў руб.

Беларускі камітэт саюзу мэталістых прапанаваў Белмэталятрэсту давесьці выпуск плугоў да 210 тыс. у год.

Разгільдзяйства на менскім тэлеграфе

Тэлеграма з Вузды ў Менск праз... 10 дзён

За апошні час у рабоце тэлеграфу па Менскай акрузе адзначаны рад сур'ёзных недахватаў. Перадача тэлеграм часта спазьняецца на цэлыя гадзіны і нават на суткі. Быў выпадак, калі тэлеграма вандравала па Менскай акрузе 10 сутак. Важная службовая карэспандэнцыя дастаўляецца са спазьненьнем на 4 гадз. У некаторых мясцох тэхнічны пэрсанал належным чынам не скарыстоўваецца. Работнікі адносяцца безадказна і напляваельскі да становішча тэлеграфнай сувязі. Раённыя тэхнікі невыстарчальна наглядаюць за становішчам станцый і лінейных пабудоў у сваіх раёнах.

Прэзыдыум ЦП саюзу нарсувязі лічыць гэтыя факты шкодніцтвам і сабатажам. Для дакладнага агляду становішча працы тэлеграфнай і тэлефоннай сувязі па Менскай акрузе вылучана спэцыяльная камісія.

Адначасова вынесена рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні працы вытворчых камісій і нарад, разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і г. д.

Характэрна адзначыць, што ЦП саюзу нарсувязі Беларусі занялося пытаньнем аб рабоце Менскага тэлеграфу толькі пасьля таго, як гэтае пытаньне абгаворвалася на пасяджэньні ЦК саюзу нарсувязі у Маскве, які прапанаваў ЦП зьнішчыць гэтыя недахваты.

30.000 пар галёш для пайнікаў гор. Менску

Менскі цэрабкоп атрымаў каля 30.000 пар галёш, якія з 16-га верасьня будуць разьмяркоўвацца сярод пайшчыкаў па талёнах. Талёны будуць разьмеркаваны па ўстановах. Прыблізна каля 75 проц. усіх пайшчыкаў будуць здаволены галёшамі. Галёшы будуць прадавацца ў крамах МЦРК, прычым да кожнай крамы прымацаваны пэўныя саюзы. Да крамы № 5 (Пляц Волі) прымацаваны калектывы прафсаюзаў нархарч, друкароў і харчавікі, да крамы № 17 (Ленінская, 19)—усе калектывы дрэваапрацоўшчыкаў, гарбароў, камунальнікаў, мэдсанпрацы, таварыства паліткатаржан, саюз рабочых папяровай прамысловасьці і ваеннізаваная варта пошты, да крамы № 18 (Пляц Волі і Ленінскай)—калектывы прафсаюзу працмедтанства, працасьветы, хэмікаў, чыгуначнікі і нарсувязь, да крамы № 53 (Савецкая № 61)—калектывы саюзу рабземлесу, вайсковыя часьці, тэкстыльшчыкі, арцелі інвалідаў страхкасы, саматужныя таварыствы і арцелі. Да крамы № 83 (Ленінская, 3)—калектывы саюзу саўгандальслужачых. Да крамы № 124 (рог Камсамольскай і Нямігі)—калектывы саюзу мэталістых, швэйнікаў і транспартнікі, да крамы № 142—(Ніжні рынак)—калектыў саюзу будаўнікоў.

Талёны маюць моц толькі на тыя дні, што паказаны на талёнах.

Новы начальнік Галоўсацстраху

На пасаду начальніка Галоўсацстраху БССР назначаны рабочы чыгуначнік з Гомелю т. П. САЛАМОНАЎ. Адначасова т. Саламонаў будзе выконваць абавязкі намесьніка Наркам. працы.

Падрыхтоўка да провадаў сэзоньнікаў

Набліжаецца час заканчэньня будаўнічага сэзону. Саюз будаўнікоў разам з культадзелам ЦСПСБ распрацоўвае мерапрыемствы провадаў сэзоньнікаў.

Будуць наладжаны ўрачыстыя сходы з педагульненьнем культасьветнай працы, праведзенай сярод сэзоньнікаў.

Выпускаецца ў колькасьці 5.000 экземпляраў памятка сэзоньніка. Яна дае грунтоўны плян працы сэзоньніка на зімовы час у раёнах і вёсках. У гэтай памятцы прадугледжаны ўсе нашы бліжэйшыя задачы: налектыўная задача хлеба дзяржаве, сацыялістычнае спаборніцтва, справа налектывізацыі, ліквідацыя няпісьменнасьці, 3-я пазыка Індустрылізацыі і г. д.

Пабудуем самалёт „Моправец Беларусі"

Ячэйка МОПР'у дзіцячага дому ў Мазыры сабрала 6 руб. на пабудову самалёту «Моправец Беларусі» і выклікае мазырскіх ячэек МОПР'у, будаўнікоў, групкому Мэдсанпрацы і заводу «Чырвоны Кастрычнік».

Коратка аб усім

Пабудова рабочай амбуляторыі паводле пляну акруговага аддзелу аховы здароўя будзе скончана ў 1929-30 годзе па Маскоўскай вул.

7 лекарскіх пунктаў адкрываюцца на буйных прадпрыемствах г. Менску.

5.000 руб. асигнавана дадаткова на канчатковую закупку карэты хуткай дапамогі. Усяго яна будзе каштаваць 17 тыс. рублёў. У лістападзе карэта будзе пушчана.

Спорт

10-га верасьня пачаўся агульны гарадзкі розыгрыш па гульнях. У першы дзень сустрэліся каманда гарбароў з камандай дрэваапрацоўшчыкаў. На баскетболе гульня скончылася з рахункам 48:18 у карысьць дрэваапрацоўшчыкаў. 11 верасьня сустрэліся на баскетболе швэйнікі з камунальнікамі, вынікі —25:17 у карысьць швэйнікаў. Сустрэча па валейболе паміж саўгандальслужачымі і будаўнікамі скончылася перамогай будаўнікоў з рахункам 2:1. 12-га верасьня працяг па гульнях. У суботу пачынаецца спаборніцтва па лёгкай атлетыцы.

***

Учора 12 футбольная каманда «Дынамо» выехала для сустрэч па футболе ў Вязьму, дзе прабудзе тры дні.

АКФК вядзе падрыхтоўчую работу да адкрыцьця зімовага сэзону і пераходу гурткоў на зімовую работу

Здарэньні

За продаж прыватнікам тавараў крымвышукам прыцягваецца да адказнасьці загадчык складу працкалектыву тэкстыльшчыкаў Коган.

За растрату прыцягваюцца да адказнасьці кандуктары Аўтакіраўніцтва Шулякоўскі і Урбанскі.

НАВІНЫ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

САМЫ ВЯЛІЗНЫ Ў СЬВЕЦЕ ДЫРЫЖАБЛЬ

Дырыжабль «Граф Цэпэлін», які нядаўна выклікаў такі шум у тэхнічных і паветраных колах, павінен саступіць месца двум ангельскім дырыжаблям Р — 100 і Р — 101, што зараз будуюцца. У той час, як умяшчальнасьць нямецкага дырыжабля складала 105.000 к. мэт. каб. 140.000 куб. мэтраў кожны. Кожны з матораў ангельскага дырыжабля мае 650 конскіх сіл, у той час, як нямецкі толькі 530 конскіх сіл (хуткасьць дырыжабля намячаецца ў 112 клм. у гадзіну, а адлегласьць, якую ён можа праляцець без пасадкі, — 6.500 кілёмэтраў).

Кабіны для пасажыраў разьмешчаны ў двух паверхах, на верхнім знаходзяцца спальні і агульны сталовы пакой, і ў ніжнім — службовыя памяшканьні: пошта, тэлеграф, радыё і г. д.

Дырыжабль прызначан для падтрыманьня сувязі паміж Англіяй і калёніямі.

ШАРАПАДОБНЫ ДОМ

У апошні час форма шара ўсё больш і больш заваёўвае сабе правы грамадзянства ў архітэктуры. На апошняй выстаўцы ў Дрэздэне быў выстаўлен шарападобны дом, а зусім нядаўна ў Амэрыцы пабудован санаторы ў выглядзе шара. Ён мае 5 паверхаў і пабудован са сталі. У гэтым санаторыі лечаць павышаным ціскам паветра, якое атрымліваецца пры дапамозе трубаправоду.

ЗАЛАТАЯ СТРАЛА

Аўтамабільны рэкорд Амэрыкі на хуткасьць у 335 кілёмэтраў у гадзіну, пастаўлены летась Кэехам, пабіты ў кайцы сакавіка г. г. ангельцам Эзэгравам на аўтамабілі новай канструкцыі «залатая страла», на якім ён дасягнуў хуткасьці ў 372 кілёмэтры ў гадзіну.

Аўтамабіль Эзэграва мае матор з 12 цыліндраў па 1.000 конскіх сіл.

Ліст у рэдакцыю

На маю кніжку «Аграрная рэвалюцыя ў сьвятле поглядаў Маркса, Энгельса і Леніна» зьмешчана ў 182 нумары «Зьвязды» рэцэнзія тав. Мяжэвіча.

На 16-й старонцы маёй кніжкі напісана: «На раду з адрозьніваньнем капіталістычнай і дакапіталістычнай формы рэнты—адпрацоўчай, натуральнай і грашовай, Маркс адрозьніваў таксама капіталістычную рэнту ад рэнты, якая атрымліваецца з парцэлярнага сялянскага зямельнага вучастку... рэнта з парцэлярнага вучастку не зьяўляецца капіталістычнай рэнтай. Парцэлярная рэнта ёсьць дадатковы прыбытак, або дадатковы прадукт тых сялян, якія карыстаюцца лепшымі вучасткамі зямлі. Акрамя таго, асаблівасьць гэтай рэнты яшчэ і ў тым, што яна не зьяўляецца адасобленай формай дадатковай вартасьці, але ідзе ў кішэню самога селяніна—зямельнага ўласьніка». Вось за гэтыя радкі з усім рэцэнзэнцкім імпэтам і ўхваціўся т. Мяжэвіч. Ён піша: «першае, можна павіншаваць т. Бондара з абагачэньнем палітэканоміі новым разуменьнем «парцэлярная рэнта». І далей: «па Бондару, мусіць, гэтыя адзнакі зусім не характэрны для рэнты, якую атрымлівае нямецкі юнкер або буйны амэрыканскі фэрмэр, таму, што гэтыя адзнакі ёсьць асаблівасьць толькі «парцэлярнай рэнты»... «Таму, мякка кажучы, абсалютна немарксыцкай зьяўляецца ў т. Бондара нават сама пастаноўка праблемы». Хто тут мае слушнасьць, зараз будзе відаць. Пачнем на парадку.

1) Выраз «парцэлярная рэнта», г. зн. рэнта з парцэлярнага зямельнага вучастку, сустракаецца ў марксыцкай літаратуры; напрыклад, у кніжцы Танхілевіч «Маркс і Энгельс о крестьянстве», выданай Ленінградскім Навукова-Дасьледчым Інстытутам мэтадалёгіі марксызму. Прычым у дзьвюх рэцэнзіях на гэтую кнігу (М. Сулкоўскі—«На аграрным фронце» № 8 за 1928 г. і А. Аляксандраў «Бальшавік» № 16 за 1928 г.), прызнаючы яе марксыцкі вытрыманай, выраз гэты ў адзначаным разуменьні ня быў асуджаны і «павіншаваць» мяне пасьля гэтага, які-б гэта гонар не прадстаўляла «з абагачэньнем п. э. новым разуменьнем» можа толькі той, хто зусім не знаёмы з літаратурай па аграрным пытаньні.

2) Рэцэнзэнт не згаджаецца з існаваньнем рэнты з парцэлярнага вучастку і з тэй асаблівасьцю яе, што яна ёсьць «дадатковы прыбытак, або дадатковы прадукт (гледзячы, на якой ступені разьвіцьця народнай гаспадаркі мы вызначаем) тых сялян, якія карыстаюцца лепшымі вучасткамі зямлі». Тут ужо т. Мяжэвіч уступае ў конторы нават з самім Марксам. Маркс наконт гэтага піша зусім ясна. Вось паслухайце: «Далее парцелярная собственность... При этой форме не уплачивается какой-бы то ни было арендной платы, следовательно, рента не выступает в качестве обособленной формы прибавочной стоимости, хотя в странах, где в других сферах получил развитие капиталистический способ производства, она при сравнении с другими отраслями производства представляется добавочной прибылью, но такой добавочной прибылью, которая, как вообще вся выручка от труда, достается крестьянину.... Даже в тех случаях, когда эта форма существует при состоянии общества, при которым еще вообще не развилась общая рыночная цена, существует эта дифференциальная рента; тогда дифференциальная рента выступает в виде избыточного прибавочного продукта. Но попадает она в карман того крестьянина, труд которого реализуется при более благоприятных естественных условиях». (Капитал, т. III, ч. II, арт. 341-342).

Аб тым, што катэгорыі капіталістычнага прыбытку, цэны вытвору і рэнты ў чыстым выглядзе ня маюць дачыненьня да дробнай таварнай гаспадаркі, пісаць ня варта, бо гэта зусім вядомая рэч.

Вось усё тое «не-марксыцкае», што змог знайсьці ў маёй кніжцы т. Мяжэвіч і з повазу чаго «разразіўся» ў сваёй рэцэнзіі.

На жаль, рэцэнзэнт закрануў адно пытаньне з маёй кніжкі і тое няўдала, я-ж чакаў больш указаньняў і парад.

Г. БОНДАР.

Паведамленьні

— БДУ. Сёньня 13-IX а 6 г. увечары адбудзецца агульны сход студэнцтва ф-ту Права і Гаспадаркі ў актавай залі БДУ.

— АДЧЫНЕНЫЯ КУРСАВЫЯ ПАРТСХОДЫ МЭДФАКУ па пытаньні чыстки партыі адбудуцца ў наступныя дні:

Пятніца, 13 верасьня—I курс., пам. чытальні мэдфаку.

Пятніца, 13 верасьня—II к., пам. Бюро ячэйкі.

Нядзеля, 15 верасьня III к., пам. Бюро ячэйкі.

Нядзеля, 15 верасьня IV і V к. к., пам. чытальні мэдфаку.

Пачатак роўна а 8-й гадз. увечары. Яўка сяброў і кандыдатаў КП(б)Б і КСМ абавязкова. Запрашаюцца беспартыйныя.

Бюро яч. КП(б)Б мэдфаку.

— ВЯЧ. РАБ. УНІВЭРСЫТЭТ. 1. У панядзелак 16 верасьня г. г. а 7-й гадз. увеч. у актавай залі БДУ (Земляробскі завул. № 4) скліканцца арганізацыйны сход ўноў паступаючых студэнтаў у Вячэрні Рабочы Унівэрсытэт.

2. Іспыты для студэнтаў 1-га і 2 курсаў Вяч. раб. унів-ту будуць праводзіцца з 15 па 31 верасьня г. г. Бібліятэка Вяч. раб. унів-ту адчынена штодзенна а 4 да 9 гадз. увечары.

— ДОМ АСЬВЕТЫ.—Сёньня 13-IX — роўна а 7-й гадз. увечары Ц. П. Саюзу Белпрацасьветы скліканае сход асьветнікаў-яўрэяў гор. Менску з наступным парадкам дня:

Даклад т. Гершанбаума аб становішчы і чарговых задачах працы культасьветустаноў.

— ДОМ АСЬВЕТЫ.—Сёньня а 6 г. увеч. адбудуцца намсамольскія заняткі аб X-м пленуме ВККІ. Яўка ўсіх намсамольцаў абавязкова.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. У суботу 14 верасьня—адчыненьне зімовага сэзону — вялікі канцэрт. Пачатак а 9 г. увечары. Білеты па групкомах і мяцкомах.

У нядзелю 15-IX а 7 г. увеч.—пасяджэньне прэзідыюма Дому.

— Да ведама ўсіх АК і РК ЛКСМБ, а таксама паступаючых на курсы КСМ АКТЫВУ. 15-га верасьня іспыты і афармленьне прыёму на курсы КСМ актыву заканчваецца. Не накіравалі на іспыты: Менскі АК ЛКСМ—7 асоб, Гомельскі—нідводнага, Віцебскі—4, Бабруйскі—7, Адшанскі—4, Полацкі—нідводнага, Мазырскі—2.

Гэтым АК і РК КСМ прапануецца выслаць камандыраваных т. т. не пазьней 15-га верасьня.

Жадаючыя паступіць у парадку вольнага прыёму павінны прыбыць 13—14 верасьня з усімі дакумантамі у камвуз Унівэрсытэцкая, 27.

— 14-га верасьня, а 2-й гадзіне дня ў памяшканьні рабфаку склікаецца сход таварышоў, камандыраваных у хэмфак БДУ ў лік «25-ці» з наступнай абвесткай дня:

1. Інфармацыя тав. Каранеўскага.

2. Аб вучэбным пляне курсаў па падрыхтоўцы—т. Лойко.

3. Выбары старастату.

Па ўсіх справах, якія датычаць курсаў, зьвяртацца да тав. Варончанка.

— Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што ў пятніцу 13-га верасьня, г. г. роўна а 6-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньня Наркамюсту (вул. Карла Маркса, 5, 3-ці паверх), адбудзецца нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, ЛКСМБ, старшынь фабзаўмясцкомаў, партыцаў, дырэктароў і кіраўнікоў устаноў-партыйцаў, старшынь вытворчых камісій і нарад-партыйцаў, рэдактароў насьценгазэт-партыйцаў, эканомпрацаўнікоў ячэек ЛКСМБ, кіраўнікоў ударных намсамольскіх брыгад, па пытаньні аб удзеле камсамольскай арганізацыі ў месячніку сацыялістычнага спаборніцтва і далейшых задачах.

Прызначанае на суботу 14-IX-г. г. у клюбе харчавікоў (Школьная вул.) адчыненьне канфэрэнцыі Фрунзаўскага Райкому МОПР'а пераносіцца туды-ж у нядзелю 15-IX а 9 г. раніцы.

Прапануецца ячэйкам МОПР'а зьявіцца ў РКом за атрыманьнем мандатаў для делегатаў на канфэрэнцыю.

Ячэйкі, якія яшчэ не абралі делегатаў, павінны паклапаціцца аб гэтым.

Выдача мандатаў адбудзецца ў РКоме да 14-IX з 7 да 9 гадз. вечара.

Сакратар Ркому МОПР'а
Ляцкга.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

У паход за грамату

Узварушым усю прапетарскую грамадзкасьць.— Дамо сродкі і памяшканьні

У таварыстве «П. Н.» («Прэч няпісьменнасьць») пры Наркамасьвеце ляжаць шматлікія дагавары з рабочымі саюзамі (харчавікоў, гарбароў, хэмікаў, паперні-каў і многа іншых) аб ліквідацыі няпісьменнасьці на працягу 1929-30 году сярод 5.962 няпісьменных і 3.109 малапісьменных.

Месячнік «За грамату» пачынае практычна ажыцьцяўляцца.

Першай сур'ёзнай задачай месячніку зьяўляецца: накіраваць думкі саміх няпісьменных па належным шляху стварыць адпаведны настрой за канчатковае вышэйчэньне няпісьменнасьці.

На прадпрыемствах, па гарадох і раёнах, у калгасах і саўгасах склікаюцца сходы і канфэрэнцыі няпісьменных, на якіх выносяцца аднагалосныя пастановы аб стопрапантным упягненьні ў ліквункты няпісьменных рабочых і сялян калгасьнікаў.

Ніводзін саюз па Менску не павінен абмінуць шырокага паходу—за грамату. Ім павінны быць зацікаўлены ня толькі культасьветнікі і загадчыкі культаддзелаў па саюзах. Кожны рабочы член саюзу павінен добра азнаёміцца з прынятымі практычнымі мерапрыемствамі.

Саюз будаўнікоў налічвае звыш 2.000 няпісьменных рабочых. На ліквідацыю няпісьменнасьці асыгнавана 17.000 р.

Гэты саюз па Менску абслугоўваецца 25 ліквунктамі: на працягу месяца будуць адкрыты новыя.

Саюз чыгуначнікаў мае ў сваіх радох яшчэ 1270 чалавек няпісьменных.

«Ніводнага няпісьменнага і малапісьменнага па-за школай!»—бліжэйшы лёзунг чыгуначнікаў. Адчыняюцца ліквункты, вядзецца школьнае, групавое і індывідуальнае навучаньне.

Асаблівай увагі на працягу месяцу патрабуе пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын. З імі, у большасьці, праводзіцца індывідуальнае навучаньне. Але каб даць магчымасьць маткам нармальна наведваць ліквункты, трэба ў дзіцячых садох і клюбах адкрыць спэцыяльныя дзіцячыя пакоі.

Паход за пісьменнасьць патрабуе прыцёку новых і новых ліквідатарскіх кадраў. Патрэбна напружанасьць сіл і энэргіі пралетарскай грамадзкасьці. Кожны студэнт і вучань старэйшых клясаў павінен увайсьці ў рады ліквідатараў.

Камсамол да гэтага часу ня склаў сваіх кадраў. Гэта зусім ненармальнае зьявішча. КСМ павінен стаць на чале вялікай справы ўсеагульнай пісьменнасьці. Да яго зьвяртаюцца з першымі запатрабаваньнямі дапамогі.

Па ўсіх раёнах БССР ідзе падрыхтоўка да адкрыцьця курсаў ліквідатараў няпісьменнасьці. Культпаход за пісьменнасьць ня мінае на сваім шляху і другіх пытаньняў і неадкладных задач культурнай рэвалюцыі. Ён павінен дапамагчы вялікай справе ўсеагульнага навучаня і дашкольнаму паходу.

Зараз у фабрычна-заводзкіх раёнах Беларусі, у калгасах і саўгасах праводзяцца сходы-канфэрэнцыі, на якіх выпрацоўваюцца мерапрыемствы культурнага парадку: адкрыцьцё цэлай сеткі новых школ, дзіцячых садоў і пакояў па клюбах. Белдзяржкіно пастанавіў па ўсіх акруговых гарадох адчыніць дзіцячыя кіно, па прыкладу менскага «Юнага піянэру».

Для ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых ухваленых практычных мерапрыемстваў патрэбна памяшканьне і сродкі. Гарсавет павінен задаволіць запатрабаваньні пралетарскай грамадзкасьці, даць магчымасьць працаваць лікпунктам, каб парасткі вялікай творчай справы не заглохлі ў самым сваім пачатку.

Сродкі таксама павінны даць вулічныя зборы на «лемантар няпісьменнаму», адлічэньні ад каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый, налічэньні на тэатральныя і кіно-прадпрыемствы.

Усе творчыя сілы нашай краіны павінны быць мабілізаваны на рашучую барацьбу з няпісьменнасьцю.

УВАГА!
па ПАНЯДЗЕЛКАХ
Кіно-тэатры Белдзяржкіно «КУЛЬТУРА», «ПРАЛЕТАРЫ», «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» і «ЮНЫ ПІЯНЭР»
АДКРЫТЫ.
Зьмена карцін па ПАНЯДЗЕЛКАХ.

КІНО-ТЭАТР „Культура"
Гістарычны мастацкі баявік
ДЖАНКІ
1-я сэрыя ў 7 частках.
Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА
Савецкая, 71.
Новы бытавы фільм
НЕ ПА ДАРОЗЕ мастацкая бытавая драма
Звыш праграмы: выступленьне папулярнага сатырыка Л. БРАУНА зусім новы рэпэртуар.
Пачатак а 8 г. 30 м. Каса—ад 7 гадз

КІНО Інтэрнацыянал
Бліскучая камэдыя вытворч. „УФА"
НЯВЕСТА БОКСЭРА
У галоўнай ролі КЭНІЯ ДЭСЬНІ і ВІЛЬЛІ ФРЫТЧ

КІНО Пралетары
На прычыне вялікага посьпеху—другі тыдзень
ПАТ І ПАТАШОН у замежным фільме
СІЛА і ХАРАСТВО
арыгінальная камэдыя ў 6-ці частках.
Пачатак а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Новы фільм
БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ
Каса адчыняна штодня ад 2 гадз. дня.
Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г.
Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.

КІНО СпартаК
Звыш праграмы гастроль С. Л. Чаргецкай-Бэнуа выканальніцы сьпеваў новага быту і шутачных народных.
НА ЭКРАНЕ выдатны нямецкі баявік
МІЛЬЁН ЗА ВЯЧЭРУ
арыгінальная кіно-п'еса ў 8 частках.
У гал. ролі ОСІ АСВАЛЬД
Каса—ад 5 г. 30 м. Пачатак а 7 г. 15 м.

Белорусское отделение Госиздата РСФСР
Советская, 41, телефон: 6-68, 8-65.
XVI КОНФЕРЕНЦИЯ ВСЕСОЮЗНОЙ КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ(б)
СТЕНОГРАФИЧЕСКИЙ ОТЧЕТ
ПОСТУПИЛ В ПРОДАЖУ
Цена 2 рубля.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра под маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
ПРЭМ'ЕРА
Пятніца, 13 верасьня „ХОЛОПКА" у 3-х дзеях Стрэльнікава
Пачатак а 8 з пал. гадз.

ІНВЭНТАРЫЗАЦЫЯ
У менскіх магазынах БЕЛПАЙГАНДЛЮ
будзе праводзіцца ў НАСТУПНЫЯ ТЭРМІНЫ:
Магазын № 1 (рог Ленінскай і Савецкай № 28-84) ад 15 да 23-IX
Магазын № 2 (Няміга рог Рэспублікан.) ад 22 да 1-X
Магазын № 3 (Школьная, 4) ад 1 да 8-X
Магазын № 4 (Ленінская вул.) ад 6 да 14-X
Просім паклапаціцца свячасовай закупкай тавараў, бо ў паказаныя дні тавары з магазынаў нікому АДПУСКАЦЦА НЯ БУДУЦЬ,
Праўленьне Белпайгандлю.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву
ПАТРЭБНЫ КАРЭКТАРЫ
для зьдельнай карэктуры рукапісаў
НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ
Аплата 2 руб. 50 коп. аркуш.

Менскаму акруговаму Саюзу Малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі
патрэбен ТЭХНІК-БУДУНІКА
Умовы платы па згодзе
Заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Камсамольская 13, Менакрмалжыўсаюзу.

Менскі дзяржаўны політэхнікум
ПАВЕДАМЛЯЕ,
што ў сувязі з павялічаным прыёмам, далучэньнем хэмаддзяленьня і рамонтам будынкаў,
заняткі на старэйшых курсах пачнуцца ў наступныя тэрміны:
На II курсе архіт., дарожн., гідрат. і тарпян. аддзяленьняў—1 кастрычніка.
На III курсе архіт., дарожн., гідрат., II курсе хэм. аддзяленьняў—16 кастрычніка.
На IV курсе архіт., дарожн., гідрат. і III і IV курсах хэм. аддзяленьня—1 лістапада.
Студэнты, якім прызначаны заняткі ўвосень, павінны зьявіцца на тыдзень.
Прэзыдыум політэхнікуму.

ПАТРАБУЕЦЦА вопытная МАШЫНІСТКА,
якая добра ведае бел.